Ніва

ТЫДНЁВІК ГП БГКТ

№ 4 (883) ГОД XVIII БЕЛАСТОК 28 СТУДЗЕНЯ 1973 г. ЦАНА 60 гр.

НА НІВЕ БГКТ

СПОСАБ ЖЫЦЦЯ НІНЫ

У апошнія дні старога года ў былой ГРН у Грыгораўцах панаваў настрой і парадак, які пануе звычайна ў хаце перад вялікім святам. Работы хоць адбаўляй! Людзі з вёсак прыходзілі па нейкія апошнія грошы, працаўнікі пакавалі паперы ў папкі. Усё рыхтавалася да выезду ў Орлю, якая стала сядзібай вялікай гміны і куды далучылі даўнейшую ГРН Грыгораўцы.


У такі гарачы час заехала я ў ГРН Грыгораўцы, шукаючы тут Ніну Філіманюк — шматгадовую працаўніцу былой тутэйшай рады, а што важнейшае для мяне, адну з найбольш заслужаных удзельніц беларускага хору ў Бельску. Не падлягае сумненню, што кожны чалавек, які гадамі сістэматычна прымае ўдзел у працы такога цікавага і карыснага культурнага калектыву, як бельскі, належыць да ліку паважаных і вартасных культурных і грамадскіх дзеячоў. Такіх «спалэчнікаў» бельскі хор мае пару дзесяткаў. Але сёння хочацца напісаць пра аднаго з іх, аднаго з вярнейшых членаў гэтай вялікай сям'і, менавіта Ніну Філіманюк. Увесь знешні выгляд, спосаб размовы і разуменне жыцця сведчаць пра вялікую асабістую культуру і інтэлігенцыю гэтай дзяўчыны. Валасы колеру каштану, кароткія; сумнаватыя вочы за акулярамі; хударлявы твар; апранутая ў нагавіцы і накідку, яна прадстаўляе вобраз сучаснай беларускай дзяўчыны, якая не захавала традыцыйнага выгляду беларускі (русая каса, кругленькая, малако з мёдам).

Ніна жыве ў маленькай (14 хат) вёсцы Падбелле пры чыгуначнай станцыі Бельск—Чаромха. Нават солтыса свайго не мае, падлягае солтысу ў Дубяжыне.

Нарадзілася Ніна ў сям'і селяніна-чыгуначніка. Мала было ў бацькоў зямлі, мала таму і працы сялянскай. Жылі з бацькавых заробкаў чыгуначніка. Шэсць год таму назад бацька памёр, і тады Ніна пайшла на працу ў ГРН у Грыгораўцах. На пытанне, ці цікавая для яе была гэта праца, сказала: «Я люблю з паперкамі вазіцца». Сказала таксама, што больш яе цягне да працы ў новай арлянскай гміне, «бо людзі свае і гэты тэрэн ведаю», чым у Бельск, куды ёй прапанавалі. Будучы аднак вучаніцай вечаровага ліцэя ў Бельску і харысткай бельскага хору, пэўна пачала працаваць у Бельску.

У хор бельскі трапіла таксама ў сумны час пасля смерці бацькі. Ездзілі ў гэты хор некалі дзяўчаты з Дубяжына. Надумалася і паехала неяк разам з імі і яна. І так пачалося. Адкрыўся перад дзяўчынай новы свет, паверыла ў свае сілы і адчула сваю вартасць, а спяваць заўсёды любіла. Добра было быць у кругу людзей і спраў, дзе планавалася і выконвалася нешта карыснае, дзе чалавек аддаваў свае здольнасці і мог адчуваць сябе актыўным і патрэбным.

Дубяжынскія дзяўчаты перасталі ездзіць на рэпетыцыі бельскага хору, бо паўстаў у іх свой хор. Ніна не перастала, і нават у думкі ніколі ёй не прыйшло, што можна хор пакінуць. На познія вечаровыя (у 19 гадзін) рэпетыцыі



прыязджала сістэматычна, хаця станцыя Падбелле ляжыць у дзесяці кіламетрах ад Бельска. А Ніна часта-часценька, не маючы часу вяртацца дадому, адразу ехала з Грыгораўцаў — 13 кіламетраў. І не перастала гэтак упарта і рэгулярна прыязджаць. Ці можна такой дзяўчынай не захапляцца? Яна мае свой стыль у выглядзе і ў працы, як прафесіянальнай так і грамадскай. Яе стыль — гэта стыль саліднасці.

А што хор ёй дае? «Нават мама кажа ўжо таксама, што мне гэтая язда нічога не дае, мо кінуць варта. Але, ведаеце, цяпер мяне было б вельмі цяжка адцягнуць ад хору. Ён стаўся маёй адзінай разрыўкай, інакш з нудаў чалавек выканчыўся б. Зжылася я з хорам, з ім пазнала кусок свету і многа людзей, тым больш, што хор наш цяпер вырас».

Вера Леўчук

НАСТАЎНІК І САМАДЗЕЙНІК

Вясною 1972 года на павятовым аглядзе драматычных гурткоў у Саколцы калектыў з далейшага ад якога-колечы вялікага цэнтра культурнага жыцця сяла Белавусы заняў першае месца і атрымаў узнагароду — магнетафон. Пастаноўка белавусаўскімі артыстамі-самадзейнікамі «Лекара міма волі» Мальера заваражыла гледачоў, а прысутны на аглядзе рэжысёр беластоцкага тэатра імя А. Вянгеркі Збігнеў Бэсэрт не мог устрымацца, каб не выразіць ім самага высокага прызнання. На працягу некалькі месяцаў калектыў выступаў са сваёй пастаноўкай чатыры разы, у тым ліку два разы ў самой Саколцы. І кожны раз зала была перапоўнена, а воплескам не было канца. На ўрачыстым адкрыцці культурна-асветнага сезону ў кастрычніку 1972 г. клуб «Руху» ў Белавусах, пры якім дзейнічае калектыў, атрымаў ад павятовага праўлення прадпрыемства па распаўсюджанню друку спецыяльную ўзнагароду — 10 тысяч злотых на музычныя інструменты. Тады ж таксама ўзышоў на сцэну невысокі шчуплы пажылы ўжо чалавек. Ён прыняў прызнаныя яму дыплом і ўзнагароду, а зала загрымела авацыямі. Гэтым сціплым, ветліва ўсміхаючымся чалавекам быў

ЭДУАРД КАЗЛОЎСКІ — ДУША КАЛЕКТЫВУ Ў БЕЛАВУСАХ.



Эдуард Казлоўскі. Фота — М. Гайдука.

Сустрэліся мы з ім у Белавусах у школе, бо Э. Казлоўскі ўжо 25 год працуе настаўнікам. Атмасфера была асаблівая: візітатар Ізабела Сядлецкая закончыла візітацыю і адразу пасля ўрокаў павінна было адбыцца падсумоўваючае працу школы пасяджэнне педагагічнага савета. Многа часу на размову мы не мелі. Але і з кароценькай гутаркі перада мною паўстаў у поўнай красе працавіты жыццёвы шлях гэтага нястомнага сеўцы высакароднага і прыгожага па сёлах Сакольшчыны. Э. Казлоўскі паходзіць з сялян з вёскі Трафімаўка, што каля Янова. Настаўнічаў у Праслаўцы, Саколцы, Васілёўцы, Янове, Красным — усё па пару год, а вось на стала абсталяваўся ў школе ў

Працяг на стар. 4

БГКТ ХРОНІКА

■ 10 студзеня адбылося пасяджэнне прэзідыума праўлення беластоцкага павятовага аддзела супольна з членамі арганізацыйнага камітэта конкурсаў на беларускую песню і тэатральных калектываў. Аддзел культуры павятовай рады нарадовай прадстаўляла Аліцыя Янкоўская, павятовае праўленне Саюза вясковай моладзі — Базыль Бэзюк, павятовую культурна-асветную парадню — Станіслава Ганеўская, павятовы аддзел добраахвотных пажарных каманд — Рышард Лось і II аддзел прадпрыемства «Рух» — Галіна Яцэвіч. Абмеркаваны былі арганізацыйныя справы і прынцыпы прызнавання ўзнагарод, а таксама было пастаноўлена, што конкурс на «Беларускую песню — 73» у Беластоцкім павеце адбудзецца 28 студзеня ў памяшканні Галоўнага праўлення БГКТ у Беластоку на вул. Варшаўскай 11. Прыме ў ім удзел больш 30 чалавек.

Затым штатны працаўнік аддзела Геня Іванюк зачытала справаздачу аб дзейнасці аддзела ў мінулым годзе і прадставіла план працы на першае паўгоддзе 1973 года. Пасля ажыўленай дыскусіі справаздача і план працы былі прыняты.

Нараду вяла Ніна Цыванюк. Прыняла ў ёй удзел кіраўнік культурна-асветнага аддзела ГП Валя Філіпюк.

■ Прэзідыум праўлення сямяціцкага аддзела 10 студзеня абмеркаваў справаздачу аб дзейнасці ў 1972 годзе і зацвердзіў план працы да канца чэрвеня 1973 г.

■ Фінальныя конкурсы на «Беларускую песню—73» і тэатральных калектываў, як заўсёды, будуць праводзіцца ў памяшканні ГП. Першы адбудзецца 25 лютага, а другі 25 сакавіка.

■ 13 студзеня ў памяшканні ГП адбылася традыцыйная карнавальная танцавальная вечарына, на якой добра гулялі члены і сімпатыкі БГКТ. Арганізатарам яе быў гарадскі аддзел БГКТ.


■ У Палацы культуры і навукі ў Варшаве варшаўскі аддзел БГКТ арганізаваў вечарыну з нагоды 50-ай гадавіны СССР. На ёй з прамоваю выступіў член ГП Віктар Швед.

Харавы калектыў бельскага аддзела 13 студзеня ў памяшканні прэзідыума мясцовай гарадской рады нарадовай арганізаваў вечарыну, прысвечаную 51-ай гадавіне ўтварэння БССР.


■ Падобная вечарына 13 студзеня адбылася ў Доме настаўніка ў Гайнаўцы, яе арганізаваў аддзел БГКТ.

■ 15 студзеня прэзідыум праўлення гарадскога аддзела БГКТ у Беластоку прыняў справаздачу аб дзейнасці аддзела ў 1972 годзе, план працы на I квартал 1973 года, а таксама абмеркаваў справы, звязаныя з арганізацыяй навагодняй ёлкі для дзяцей, бацькі якіх з'яўляюцца членамі БГКТ. У сувязі з выездам з Беластока сакратара праўлення аддзела Зосі Стаськевіч у студзені ўсімі справамі аддзела займецца член Прэзідыума аддзела Анна Амбражэй.

■ У гуртках БГКТ у Юшкавым Грудзе, Баброўніках, Пяньках і Новай Волі (Беластоцкі павет) адбыліся сходы з удзелам штатнага працаўніка аддзела Гені Іванюк. На іх абмяркоўваліся актуальныя справы гурткоў і найбольш увагі было прысвечана конкурсу на беларускую песню. Вельмі цікава выглядае гэта справа ў Новай Волі. Там рыхтуюцца два вакальныя калектывы. Адзін з моладзі, а другі са старэйшых асоб. (мх)



Бельскія кантрасты. *Фота Я. Цялушэцкага*



СВЕТ

КАСМІЧНЫ ПОСПЕХ

Газеты, радыё і тэлебачанне шырока адзначалі новы касмічны поспех — пасадку станцыі «Месяц - 21», якая даставіла на паверхню Месяца аўтаматычны апарат «Лунаход - 2».

Генеральны дырэктар Нацыянальнага цэнтра па касмічных даследаваннях Францыі сказаў наступнае:

«Я віншую ад усёй душы савецкіх вучоных з яшчэ адным пераканаўчым поспехам у даследаванні космасу. Мне прыемна адзначыць, што на станцыі «Лунаход - 2» устаноўлены лазерны адбівальнік французскай вытворчасці. Франка-савецкае супрацоўніцтва ў вывучэнні касмічнай прасторы паспяхова развіваецца. Новы эксперымент, які мы зможам правесці разам з савецкімі вучонымі, з'яўляецца другім эксперыментам такога роду.»

НАРАДА МІНІСТРАЎ

15 і 16 студзеня ў Маскве адбылася нарада міністраў замежных спраў Балгарыі, Венгрыі, ГДР, Польшчы, Румыніі, Савецкага Саюза і Чэхаславакіі.

На нарадзе абмяркоўваліся пытанні, што маюць адносіны да бяспекі ў Еўропе і тых крокаў, якія з'яўляюцца прадметам абмену думкамі паміж зацікаўленымі дзяржавамі.

ВЫЯЗНАЯ СЕСІЯ САВЕТА БЯСПЕКІ

У адпаведнасці з просьбай урада Панамы Савет Бяспекі ААН адобрыў прапанову аб правядзенні ў Панаме з 15 па 21 сакавіка гэтага года выязной сесіі Савета.

Тлумачачы матывы, якімі кіраваўся ўрад Панамы, уносячы прапанову аб правядзенні пасяджэнняў Савета Бяспекі на тэрыторыі Панамы, пастаянны прадстаўнік гэтай краіны ў ААН падкрэсліў, што яго ўрад мае намер паставіць пытанне аб недапушчальнасці захавання на тэрыторыі Панамы каланіяльнага анклава і спроб раскрадання яе прыродных багаццяў. Прадстаўнік Панамы сказаў, што Панамскі канал павінен быць зонай, поўнасцю свабоднай ад якіх-небудзь ваенных аперацый, і што ён не павінен кіравацца замежнымі дзяржавамі.

Цяпер, як вядома, Злучаныя Штаты, навязаўшы Панаме кабальнае пагадненне, пераўтварылі ўсю зону канала ў сваю вотчыну, дзе яны распараджаюцца настолькі бессаромна, што нават зрабілі яе забароненай зонай для грамадзян Панамы.

ВЫГАНЯЮЦЬ КАРЭННАЕ НАСЕЛЬНІЦТВА

Паводле паступаючых з акупіраваных тэрыторый звестак, ізраільскія ўлады зносяць цэлыя арабскія кварталы, на месцы якіх будуюцца яўрэйскія пасяленні. Карэннае насельніцтва выганяецца са сваіх дамоў. Акупанты плануюць стварыць у наваколлі Іерусаліма 13 ваенізаваных пасяленняў. Большая іх частка будзе знаходзіцца ў раёнах, раней населеных арабамі. Паводле заявы міністэрства жыллёвага будаўніцтва Ізраіля, да 1975 года ва ўсходняй частцы Іерусаліма намечана пасяліць 65 тысяч яўрэяў.

(ак)



БССР

ФРАНЦУЗСКІЯ ТВОРЫ НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Як вядома, на беларускай зямлі адбылася сустрэча генеральнага сакратара ЦК КПСС Л. І. Брэжнева з прэзідэнтам Французскай рэспублікі Ж. Пампіду.

З гэтай нагоды варта прыпомніць, што Савецкая Беларусь утрымоўвае цесныя культурныя сувязі з Францыяй. На беларускую мову перакладзена 86 твораў французскіх паэтаў і пісьменнікаў. Іх агульны тыраж склаў 3 мільёны 67 тысяч экземпляраў. Асабліва вялікім зацікаўленнем карыстаюцца Дзюма, Бальзак, Ралан, Стэндаль, Жорж Санд. Вялікі поспех у беларускіх чытачоў мелі зборнік «Французскія паэты — дзецям», аповесць «Маленькі прынц» Экзюперы, кніга выбраных твораў Беранжэ.

АМНІСТЫЯ

Як падае агенцтва БЕЛТА, у Прэзідыуме Вярхоўнага Савета Беларускай ССР адбылася нарада старшынь камісій выканаўчых камітэтаў абласных і Мінскага гарадскога Саветаў дэпутатаў працоўных, работнікаў органаў унутраных спраў, пракуратуры і судоў па пытанню выканання ўказа Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 28 снежня 1972 года «Аб амністыі ў сувязі з 50-годдзем утварэння Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік».

БАЛЕТ «АЛЬПІЙСКАЯ БАЛАДА»

Тыднёвік «Літаратура і мастацтва» падае, што ў Чэлябінскім тэатры оперы і балету імя М. І. Глінкі адбылася прэм'ера балету «Альпійская балада» Я. Глебава. Лібрэта да яго па матывах аповесці Васіля Быкава напісаў Р. Чарахоўскі.

Такім чынам, вядомы твор выдатнага беларускага пісьменніка атрымаў яшчэ адно новае жыццё. «ЛіМ» адзначае, што беларускі кампазітар Я. Глебаў таленавіта пераўтварыў лібрэта «Альпійскай балады» ў яркае музычнае апавяданне.

У ГАЛІНЕ НАВУКІ

У Мінску пачаў працаваць навукова-даследчы інстытут парашковай металургіі. Дырэктар інстытута, прафесар А. В. Роман заявіў, што металакерамічная вытворчасць дае магчымасць значна скараціць расход металаў і павысіць прадукцыйнасць працы амаль у два разы.

ЛАЎРЭАТЫ

Дзяржаўныя прэміі БССР імя Янкі Купалы за 1972 год прысуджаны Кастусю Кірэенку, выдатнаму беларускаму паэту, за зборнік вершаў «Кніга ста песень».

Лаўрэатам «Коласаўскай» прэміі стаў Іван Навуменка, аўтар вядомых прац пра Купалу і Коласа.

ПАЛАЦ КУЛЬТУРЫ

У калгасе «1 мая» аддадзены ў карыстанне Палац культуры, які поўнасцю падрыхтаваны для карыснага і культурнага адпачынку. Ёсць там прасторная глядзельная зала, бібліятэка з чытальняй, пакоі для мастацкай самадзейнасці, вялікая зала для танцаў і масавых гульняў. (вр)



ПОЛЬШЧА

ПАСЯДЖЭННЕ ПАЛІТБЮРО

16 студзеня адбылося пасяджэнне Палітбюро ЦК ПАРП, на якім была разгледжана справаздача аб масавым спорце ў нашай краіне. Палітбюро прыняло напрамкі дзейнасці ў гэтай галіне на наступныя гады. Чарговай справай, якая разглядалася, была абмяркоўка інфармацыі міністра здароўя і грамадскай апекі на тэму здароўя жыхароў гарадоў і вёсак, а перш за ўсё дзяцей і моладзі, і прыняцце неабходных мер для яшчэ лепшай арганізацыі медыцынскай дапамогі. На заканчэнне пасяджэння Палітбюро ЦК ПАРП знаёмілася з арганізацыйнымі працамі, звязанымі з дзейнасцю нядаўна створаных камітэтаў Нацыянальнага фонду аховы здароўя, і разгледзела асноўныя праблемы рэалізацыі інвестыцый у 1973 годзе. У апошнім пункце праграмы пасяджэння Палітбюро асаблівую ўвагу звярнула на датэрміновую перадачу прамысловых аб'ектаў у карыстанне.

УРАЧЫСТАЯ АКАДЭМІЯ

У сувязі з святкаваннем 28-ай гадавіны вызвалення Варшавы ў нашай сталіцы адбыліся шматлікія ўрачыстыя мерапрыемствы, напамінаючыя аб гераічных падзеях горада і гераізме яго жыхароў, аб часах пасляваеннай адбудовы і будове аб'ектаў у наш перыяд.

Цэнтральная акадэмія з гэтай нагоды адбылася ў Палацы культуры і навукі. Прымалі ў ёй удзел жыхары Варшавы і запрошаныя госці з усёй краіны.

ВІЗІТ Э. ГЕРКА

18 студзеня І сакратар ЦК ПАРП Э. Герэк знаёміўся з працай рабочых калектываў капальні медзі «Палькавіцэ», камбіната ў Любліне, капальні медзі «Рудна» і гуты медзі ў Глогаве. Рабочыя сардэчна віталі госця і рапартавалі аб прынятых абавязацельствах адносна дадатковай прадукцыі.

ПЛЕНАРНАЕ ПАСЯДЖЭННЕ ВК ПАРП У АПОЛІ

16 студзеня адбылося пленарнае пасяджэнне Ваяводскага камітэта партыі ў Аполі. Галоўнай тэмай пасяджэння была дзейнасць апольскіх партарганізацый у рэалізацыі грамадска-гаспадарчых задач у 1973 годзе. У пасяджэнні прымаў удзел член Палітбюро ЦК ПАРП, старшыня Рады Дзяржавы Г. Яблонскі.

НАРАДА Ў ГП ТППР

17 студзеня адбылася нарада ў Галоўным праўленні ТППР, якая прысвячалася абмяркоўцы актуальных задач гэтай арганізацыі. У нарадзе прымаў удзел член Палітбюро, сакратар ЦК ПАРП, старшыня ГП ТППР Ян Шыдляк. У дыскусіі старшыні ваяводскіх праўленняў ТППР паінфармавалі аб удзеле мясцовых звенняў таварыства ў святкаванні 50-ай гадавіны СССР і аб сёлетніх планах дзейнасці арганізацыі.

НОВЫЯ ЭНЕРГЕТЫЧНЫЯ АБ'ЕКТЫ

У гэтым годзе распачнецца будова трох новых электрастанцый у Явожне, Паланцы і Жарноўцы. У карыстанне будуць яны перададзены ў першыя гады наступнай пяцігодкі. У суме дадуць яны дзяржаве 3.400 мегаватаў электраэнергіі.

У гэтым годзе закончыцца будова дадатковага электрычнага абсталявання на электрастанцыях у Казяніцах, Рыбніку, Астралэнцы і Понтнаве.

(яц)



ВАЯВОДСТВА

У АДКАЗ НА ЗАКЛІК

Беластоцкія прамысловыя прадпрыемствы ўклалі шмат працы і ініцыятывы ў мінулагоднюю акцыю «20 мільярдаў». За свае дасягненні цэламу шэрагу прадпрыемстваў Беласточчыны былі ўручаны ганаровыя дыпломы Сакратарыята ЦК і Прэзідыума ўрада.

Чыгуначнае прадпрыемства стальных канструкцый у Старасельцах з'яўляецца адным з перадавых у краіне. Гэтаму прадпрыемству ганаровы дыплом Сакратарыята ЦК і Прэзідыума ўрада ўручыў І сакратар ВК партыі З. Куроўскі. КЗКС дало ў мінулым годзе дадатковай прадукцыі на суму больш 10 мільёнаў злотых. У размове з І сакратаром ВК кіраўнікі прадпрыемства парушалі справы разбудовы фабрыкі, паляпшэння сацыяльных умоў і магчымасцей дадатковай прадукцыі ў гэтым годзе.

Аб магчымасцях даць дадатковую прадукцыю ў 1973 годзе, у адказ на заклік Сакратарыята ЦК і Прэзідыума ўрада, рапартуюць амаль усе больш значныя прадпрыемствы Беласточчыны. Новыя абавязацельствы прымаюцца на канферэнцыях рабочага самаўпраўлення.

БУДЗЕ ЦЯПЛЕЙ

20 студзеня ў электрацяплоўні ў Беластоку адбылася ўрачыстая перадача ў карыстанне трэцяга, але найбольшага катла. Будаўнікам удалося скараціць час будовы катла з 22 да 9 месяцаў. Кацёл планавалася аддаць у карыстанне аж у канцы гэтага года. На ўрачыстасці прысутнічалі гаспадары ваяводства — І сакратар ВК ПАРП З. Куроўскі і старшыня Прэзідыума ВРН З. Спрыха, а таксама прадстаўнікі цэнтральных улад — віцэ-міністр энергетыкі Б. Бартошэк і віцэ-міністр будаўніцтва А. Шоэда.

З ПАСЯДЖЭННЯ ПРЭЗІДЫУМА ВРН

17 студзеня адбылося чарговае пасяджэнне Прэзідыума ВРН. Ацэньвалася магчымасць хутчэйшага выканання пяцігадовага плана ў сельскай гаспадарцы. У мінулыя гады ўдалося дабіцца шэрагу добрых вынікаў у галіне сельскагаспадарчай вытворчасці: павялічыўся сярэдні ўраджай збожжа, палепшылася структура пасеваў, павялічылася пагалоўе жывёлы на 100 га ўгоддзяў, узрасла таварнасць прадукцыі. Прэзідыум ВРН лічыць, што ёсць магчымасці выканаць раней планы на 1975 год. Але гэта патрабавала б павелічэння мінеральнага ўгнаення да 156 кг на гектар, забеспячэння высокаўраджайнага насеннага матэрыялу, паляпшэння пародзістасці жывёлы, хутчэйшага гаспадарчага будаўніцтва.

На пасяджэнні былі зацверджаны планы прасторавага загаспадарання Гайнаўкі і Саколкі.

ПГР У ЛЕЗЕ — НАЙЛЕПШЫ

ПГР-ы у Лезе і Страдунах з'яўляюцца найлепшай дзяржаўнай сельскай гаспадаркай ў нашым ваяводстве. Калектыў ПГР з Легі ў мінулым годзе даў дадаткова на рынак ялавічыны на суму 1,8 мільёна злотых, а гаспадарка ў Страдунах, якая належыць да гэтага ж ПГР-у, — на суму 1 мільёна злотых. ПГР атрымала ганаровы дыплом Сакратарыята ЦК і Прэзідыума ўрада. Калектыў прадпрыемства абавязаўся даць у гэтым годзе дадаткова мяса на суму 2,5 мільёна злотых. (яч)



NIEDZIELA 28.I.

7.40 Program dnia. 7.45 TV Kurs Rolniczy. 8.20 „Przypominamy, radzimy". 8.30 „Nowoczesność w domu i zagrodzie". 9.00 Dla młodych widzów: TELERANEK. 10.20 „Antena". 10.35 „W starym kinie" — „Bohaterowie seriali". 11.25 Reportaż z II Światowego Festiwalu Polonijnych Zespołów Artystycznych — Rzeszów 1972. 11.55 Dziennik. 12.10 Sportowy magazyn sprawozdawczy. 14.00 „Przemiany". 14.30 Dla dzieci: II TV Festiwal Widowisk Lalkowych dla Dzieci — zakończenie. 15.30 „Podróż do Nusantary" („Klub Sześciu Kontynentów"). 16.15 „Gościniec albo opisanie Warszawy" — teleturniej z okazji 600-lecia Woli. 17.10 „Pamięć" — film dok. radz. 18.30 „Tele-Echo". 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.05 „Śmierć Boryny" — film TVP („Chłopi") odc. X. 21.05 PKF. 21.15 „Karnawał" („Melodie Wielkiego Ekranu"). 22.15 Magazyn sportowy.

PONIEDZIAŁEK 29.I.

12.45 TV Technikum Rolnicze: Wskazówki metodyczne — cz. I. 13.20 TV Technikum Rolnicze: Wskazówki metodyczne — cz. II. 15.30 i 22.45 Politechnika TV. Kurs przygotowawczy. Fizyka. 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 „Zwierzyniec". 17.25 „Echo stadionu". 17.50 „Spacerkiem po kinach". 18.25 TV Kurier Warszawski. 18.45 Magazyn Postępu Technicznego. 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.05 Teatr TV: A. Fredro — „Ciotunia". 21.25 Publicystyka międzynarodowa. 21.55 Dziennik. 22.15 Transmisja II części koncertu z okazji Dnia Handlowca.

WTOREK 30.I.

8.50 „Śmierć Boryny" — film TVP („Chłopi") odc. X. 9.55 Dla szkół: (kl. II lic.) Język polski — J. Słowacki „Balladyna". 10.55 Dla szkół: (kl. III lic.) Język polski — L. Pirandello — „Tak jest, jak się państwu zdaje". 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 TELEWIZJA MŁODYCH. 18.10 Program filmowy. 18.25 TV Kurier Mazowiecki. 18.45 „Orbita" — mag. nauki i techniki krajów socjalistycznych. 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.05 Kino Interesujących Filmów: „Miłosne rozterki" — film fab. ang. (od lat 16). 21.00 „Paleta słońca" — film. 21.30 „360 stopni wokół Marisoll" — program rozr. hiszp. 22.10 Dziennik. Wiadomości sportowe.

ŚRODA 31.I.

10.00 „Miłosne rozterki" — film fab. ang. (od lat 16). 10.55 Dla szkół: (kl. VII—VIII) Wychowanie plastyczne — „Wzornictwo przemysłowe". 12.45 TV Technikum Rolnicze: Wskazówki metodyczne — cz. I. 13.20 TV Technikum Rolnicze: Wskazówki metodyczne — cz. II. 14.00 „Wybieramy zawód". 15.20 i 23.35 Politechnika TV. Kurs przygotowawczy. Matematyka. 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 Dla młodych widzów: „Piękno, moda i uroda" („Obyczaje"). 17.05 Dla dzieci: „Psy to psy a koty koty". 17.40 „Informacje, Towary, Propozycje". 17.55 „Łososiowce z Władysławowa" („Morskie spotkania"). 18.25 TV Kurier Warszawski. 18.45 „Sami o sobie". 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.05 Studio 63: M. Żuławski — „Porzeczki" („Opowieści mojej żony"). 20.25 „Daria" — film fab. radz. cz. II. 21.50 „Świat i Polska". 22.25 Dziennik. Wiadomości sportowe. 22.50 „Artyści, których podziwiamy" — Bogna Sokorska.

CZWARTEK 1.II.

9.00 „Daria" — film fab. radz. 12.45 Dla szkół: (kl. I—IV lic.) Język polski — „Poemat epicki". 14.00 Matematyka w szkole: „Przygotowanie pojęcia osi liczbowej". 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 „Ekran z bratkiem". 17.45 PKF. 18.10 „ZSRR-50" — „Kazachska SRR". 19.10 „Przypominamy, radzimy". 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.05 „Inspektor wydziału kryminalnego" — film. fab. radz. 21.35 „Raport z FSM". 22.00 Dziennik. Wiadomości sportowe. 22.25 „Groch z kapustą" wg J. Tuwima.

PIĄTEK 2.II.

9.00 „Inspektor wydziału kryminalnego" — film fab. radz. 10.55 Dla szkół: (kl. II) „Jadą traktory". 12.45 TV Technikum Rolnicze: Wskazówki metodyczne. 13.20 TV Technikum Rolnicze: Język polski — lekcja 1. 15.20 Politechnika TV. Kurs przygotowawczy. Rysunek techniczny. 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 „Pora na Telesfora". 17.25 „Nie tylko dla pań". 17.45 „Gramy o telewizor". 18.10 „Tyrystyka i wypoczynek". 18.25 TV Kurier Mazowiecki. 18.25 Magazyn oświatowo-wychowawczy. 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.05 „Ostatni rok" — film dok. radz. 21.15 Panorama Tygodnia. 21.55 Teatr TV na świecie: J. Arbes — „Romanetto" — spektakl TV Czechosłowackiej. 23.00 Dziennik. Wiadomości sportowe.

SOBOTA 3.II.

8.00 „Traper z Kentucky" — film fab. (od lat 16). 9.55 Dla szkół: (kl. VII) Zoologia — „Ryby". 12.45 TV Technikum Rolnicze: Wskazówki metodyczne. 13.20 TV Technikum Rolnicze: Język polski — lekcja 1. 15.25 Program dnia. 15.30 Program I proponuje. 15.50 Redakcja Szkolna zapowiada. 16.05 TV Informator Wydawniczy. 16.30 Dziennik. 16.45 Dla młodych widzów: Konkurs pięciu milionów. 17.45 „Z kamerą wśród zwierząt". 18.15 Program filmowy. 18.35 „Godzina Orfeusza". 19.20 Dobranoc. 19.30 Monitor. 20.15 „Traper z Kentucky" — film fab. (od lat 16). 21.55 Dziennik. Wiadomości sportowe. 22.20 „Wariacje na lodzie" — występ zespołu radzieckiego. 23.05 Program rozrywkowy.



Piątek, 26 stycznia

10.10 Szkoła szachowa. 10.40 Filmy dokument. 13.55 Program dnia. 14.30 Film dokument. 15.00 Zdrowie. 17.30 Wieczór literacki. 18.30 Artysta ludowy RSFSR J. Kibkała. 19.00 Czas. 19.30 „Cyrk". Film fab.


Sobota, 27 stycznia

7.00 Program dnia. 7.30 Koncert. 9.00 Przegląd międzynarodowy. 9.50 Film dokument. 10.45 Turniej TV. 11.50 Film animowany dla dzieci. 12.45 Film fab. 16.10 Białe i czarne. 17.40 Spektakl. 19.00 Czas. 19.30 c. d. spektaklu. 21.00 Koncert.

Niedziela, 28 stycznia

7.00 Program dnia. 8.00 Kiosk muzyczny. 8.30 Dla żołnierzy. 9.00 Koncert. 9.45 Filmy animowane. 12.00 Spektakl teatru kukiełkowego. 12.50 Tańczcie z nami. 14.15 Spotkania literackie. 15.00 Klub filmowy. 16.10 Panorama filmowa. 17.35 Wieczór autorski kompozytora E. Kołmanowskiego. Transmisja z Sali Kolumnowej. 19.00 Czas. 19.30 c. d. wieczoru Kołmanowskiego. 20.30 Koszykówka. CSKA — „Kalew" (Tartu).

Першая ўрачыстая



У першых днях студзеня 1973 года адбыліся першыя ўрачыстыя сесіі гмінных радаў нарадовых. Нам давялося прымаць удзел у шымкаўскай сесіі.

Гміна Шымкі — адна з дванаццаці ў Беластоцкім павеце. Яна ахоплівае амаль 16 тысяч гектараў зямлі ў прыгранічным раёне, дзе жыве каля 5 тысяч асоб.

Гміна Шымкі мае выключна сельскагаспадарчы характар. Да яе эканамічных і грамадскіх праблем будзе яшчэ нагода вярнуцца, а цяпер прапануем увазе нашых чытачоў фатаграфічную дакументацыю з гэтай сесіі.

Адкрыў яе старэйшына сярод радных Ян Леўшук з Шымкаў (здымак I).



Першая ўрачыстая сесія Шымкаўскай гміннай рады адбылася ў гімнастычнай зале пачатковай школы ў Ялоўцы. Гэта не таму, каб радныя адразу, на пачатку сваёй дзейнасці пасля адміністрацыйнай рэформы вымушаны былі добра гімнастыкавацца ў пагадненні інтарэсаў сваіх выбаршчыкаў з інтарэсамі агульнадзяржаўнымі. Проста святліцу ў нядаўна пабудаванай сядзібе Шымкаўскай ГРН прыйшлося перагарадзіць на патрэбы раптам пашыранай адміністрацыі і ў сувязі з гэтым не было дзе ў Шымках змясціць такой колькасці людзей. Але шмат чаго цяпер там будуецца і праз які год-два падобных клопатаў шымкаўцы мець ужо не будуць.

У першым радзе (здымак 2) пазнаю шматгадовых тутэйшых грамадскіх дзеячоў: Уладзіміра Стэльмашука з Дублян (першы злева), Віктара Гапуніка з Ганчароў і Яна Ваўрэшука з Навасадаў.


Сесія праходзіла ва ўрачыстым настроі. Аднак гэты ўрачысты настрой не быў у сілах, на жаль, абагрэць залы, якой на працягу двух тыдняў ніхто не атопліваў. Таму ўсе радныя сядзяць у цёплай вопратцы. Толькі прэзідыум сесіі геройскі вытрымоўваў у адных святочных касцюмах.

Сакратар прэзідыума ПРН у Беластоку Валянцін Тафткевіч (здымак 3) аб'яўляе пастанову Ваяводскай рады аб устанаўленні гміны ў Шымках. «Гэты акт, — заяўляе ён, — пільна сцеражыце і старанна перахоўвайце. Ён устанаўляе спраўную адміністрацыйную адзінку, якая ў сілах вырашаць на месцы ўсе праблемы сялян і іншых жыхароў тутэйшай гміны».

На гэтай сесіі радныя стварылі 4 рабочыя камісіі і ў тайным галасаванні выбралі старшыню рады і яго намесніка. Голас аддае сакратар гміннага камітэта ПАРП у Шымках Яўгеній Азябла (здымак 4). У выніку тайнага галасавання старшынёю Шымкаўскай ГРН радныя выбралі вядомага ў гэтым раёне грамадскага дзеяча Мікалая Мікуця з Бандароў, які сам шмат год працаваў у радах нарадовых. Яго намеснікам стаў Ян Леўшук з Шымкаў.

Пасля гэтага радныя пазнаёміліся з начальнікам сваёй гміны Балеславам Сурдацкім (здымак 5). Многія з іх ведалі яго ўжо раней. Балеслаў Сурдацкі на працягу 9 апошніх гадоў настаўнічаў у ялоўскай школе. Прыехаў ён на Беласточчыну здалёк — аж з Хрубяшоўскага павету ў Жэшоўскім ваяводстве, але ў Ялоўцы заснаваў сваё сямейнае гняздо і не мае ўжо намеру пакідаць нашага ваяводства. Яму ледзь 27 год. Мае няпоўную вышэйшую адукацыю, якую рашыў папоўніць, энергічны, аптымістычна глядзіць у будучыню гэтай часцінкі нашай краіны.

Тэкст і фота В. Рудчык







Заўсёды паўтаралі мы (і паўтараць будзем), што Беласточчына — невычэрпная крыніца фальклору. Штораз часцей нашы калектывы, працуючыя пад патранатам БГКТ, будуюць сваю праграму на фальклоры. Але дагэтуль яшчэ не пісалі мы пра калядныя калектывы. А яны ёсць, і ў калядны перыяд, паводле прыблізных даденых Ваяводскага дома культуры ў Беластоку, паяўляецца іх у ваяводстве аж некалькі соцень. З'яўляецца гэты культурна-абрадавы рух найбольш шырокай формай культурнай дзейнасці. Колькі звёзд, колькі батлеек, выкананых з вялікім мастацкім знаўствам, колькі дасціпных народных песень і пагаворак грыміць тады па хатах і вуліцах вёсак і гарадоў! Колькі калядных вясёлых карагодаў праходзіць тады ўздоўж і ўшыр Беластоцкай зямлі!

Каб заапекавацца гэтым рухам і ўключыць яго ў агульны нурт багатай самадзейнасці ваяводства, аддзел культуры Прэзідыума ВРН у Беластоку, Ваяводскі дом культуры з культурнай парадняй і павятовыя дамы культуры, а таксама Саюз добраахвотнай стражы пажарнай арганізавалі і праводзяць першы раз у ваяводстве агляд калядных і абрадавых калектываў.

Агляд калядных і абрадавых калектываў

Да сённяшняга дня закончыліся агляды ў паветах. Адбыліся яны ў 11 паветах, якія сумелі арганізаваць і правесці гэтыя агляды ў сябе. Усе паветы, дзе пражывае беларуская нацыянальная меншасць, удзел у гэтых аглядах прынялі. Разам усіх калектываў, якія выступілі на павятовых аглядах, было звыш дзевяноста.

Двухдзённы ваяводскі агляд адбудзецца ў Беластоку 17 і 18 лютага і дапушчаны да яго будуць найлепшыя па ўзроўню і якасці калектывы, незалежна ад паветаў.

Цікавіў нас удзел калядных калектываў з беларускіх вёсак. Ці былі яны, ці многа, з якіх вёсак? Аказваецца, што ў гэтай форме нацыянальныя беларускія калядныя і абрадавыя звычаі прадстаўляюць вялікае багацце і займаюць другое месца пасля Курпёўшчыны. З усіх паветаў, дзе жыве беларускае насельніцтва, удзел у аглядах прадстаўлены вельмі шырока. Яшчэ не маем назваў найцікавейшых калектываў і назваў вёсак, з якіх яны родам, але Ваяводскі дом культуры паведаміў нам, што калі ўзяць пад увагу жывасць калядных і абрадавых традыцый і багацце фальклору, то найлепш прадстаўляецца яна ў паветах Сямяціцкім, Гайнаўскім, Сакольскім, а потым толькі ідзе Высокамазавецкі, Манецкі і Граеўскі паветы. Калі прыняць пад увагу формы мастацкага прадстаўлення каляднага і абрадавага фальклору, то найбагацейшыя яны ізноў жа ў Сямяціцкім павеце, а потым ідуць Высокамазавецкі і Граеўскі паветы.

Ваяводскага агляду калядных і абрадавых калектываў з вялікім зацікаўленнем чакаюць кругі культурных дзеячоў, верачы, што нарэшце наша фальклорнае багацце выйдзе на шырокі свет і змогуць людзі пабачыць, чым нашы хаты багаты.

З свайго боку цешымся вельмі, што ідэя збірання, захавання, даследавання і выкарыстоўвання фальклору ў шырокай культурнай дзейнасці ахоплівае ўсё большыя кругі людзей, і знаходзіць усё больш прыхільнікаў. Мы заўсёды былі за!

Вера Леўчук

МАЛАДЫЯ З ШЫМАК

У вёсцы Шымкі Беластоцкага павету ёсць нямала моладзі.

Свае культурныя імкненні моладзь рэалізуе ў клубе «Руху». У клубе адзначаліся шматлікімі мерапрыемствамі такія гадавіны, як 50-годдзе СССР або 90-годдзе з дня нараджэння Якуба Коласа, тут прайшла алімпіяда асветна-палітычных ведаў, кулінарныя курсы, сходы вясковых маладзёжных і грамадскіх арганізацый. Моладзь прыходзіць сюды пачытаць прэсу (пры тым неабходна падкрэсліць, што чытае яе многа), паглядзець тэлевізар, пагутарыць са знаёмымі. Члены ЗМВ і БГКТ намераны арганізаваць інструментальны калектыў і аматарскі драмгурток. Зроблены ўжо першыя крокі.

Члены ЛЗС пабудавалі грамадскім чынам спартыўную пляцоўку. Шымкаўская футбольная каманда ў мінулым годзе спаборнічала ў розыгрышах за тое, каб увайсці ў «Б» клас.

Маладыя жанчыны з КГВ (старшыня яго Вера Раманчук) занялі першае месца ў павеце ў конкурсе на «Найпрыгажэйшы букет агародніны». Вырасцілі яны некалькі сартоў малавядомай агародніны, а ўжо найлепш ім удаўся ярмуж. За атрыманую ўзнагароду жанчыны пастанавілі купіць сабе пару дзесяткаў фруктовых дрэўцаў і пасадзіць іх, а таксама купіць апырсквачы для апырсквання гэтых пладовых дрэў.

(ця)

Колькі чаго чытаюць

Паводле даных пошты ў Бельску Падляшскім, у мінулым 1972 годзе ў павеце было больш як 19 тыс. падпісчыкаў розных часопісаў. На часопіс «Аграхімія», дзякуючы намаганням сельскагаспадарчай службы і працаўнікоў пасобных поштаў, падпісалася 4045 асоб. На сельскагаспадарчую газету «Наша весь» у канцы года было 1366 падпісчыкаў. Жыхары Бельшчыны выпісвалі ў канцы снежня 1972 г. 1588 экземпляраў газеты «Грамада Рольнік Польскі». «Газета Беластоцкая» мела 3620 падпісчыкаў, «Зялёны штандар» — 126, «Хлопская дрога» — 719. Іншыя газеты і часопісы мелі значна менш падпісчыкаў.

На Бельшчыне ў канцы 1972 года 1341 чалавек выпісваў «Ніву». Найбольшай колькасці чытачоў дабілася пошта ў Рыбалах. Там было 218 падпісчыкаў. Другое месца заняла пошта ў Грыгароўцах — 167 падпісчыкаў і трэцяе месца пошта ў Пасынках — 176 падпісчыкаў.

Насоўваецца пытанне — ці 1341 падпісчык «Нівы» ў павеце гэта многа ці мала? Калі прыняць пад увагу той факт, што беларускае насельніцтва займае па колькасці палавіну насельніцтва Бельшчыны, дык лік гэты задавальняючы. А калі разглядаць магчымасці павелічэння чытачоў «Нівы» ў Бельскім павеце, дык яны вялікія і лік гэты недастатковы. У вышэй пададзеныя лікі не ўваходзіць продаж газет у кіёсках «Руху». (мх)

У Беластоку спяваюць і танцуюць

Так коратка можна акрэсліць заняткі беларускага калектыву, які працуе цяпер у Беластоку пры гарадскім аддзеле БГКТ. Вядзе яго інструктар ГП Янка Крупа. 38 дзяўчат і хлопцаў прыходзяць на рэпетыцыі гэтага калектыву ў будынак Галоўнага праўлення два разы ў тыдзень — у чацвяргі і нядзелі.

Наведалі мы адну з такіх рэпетыцый. Прыемна было глядзець, як гэты вакальна-танцавальны калектыў рыхтуецца да першага публічнага выступлення, якое яны запланавалі на канец лютага, на гадавіну Савецкай Арміі.

Дзяўчаты і хлопцы спявалі і танцавалі якраз бадзёрую песню: «Кума мая, кумачка, дзе жывеш». Раскручваўся і закручваўся гэты вясёлы малады карагод.

Трэба сказаць, што цікавая канцэпцыя, якую Крупа хоча рэалізаваць з беластоцкім калектывам: менавіта, не статычная група людзей, якая толькі спявае, але калектыў у пастаянным руху на сцэне, дзе словы, гукі і танцавальныя крокі складаюць адну цэласць.

Гэта цяпер, зрэшты, найбольш сучасная форма, якая прымяняецца ва ўсіх вядомых калектывах, між іншым, у «Мазоўшы» і «Шлёнску», а таксама ў замежных калектывах.

Да свайго першага экзамена калектыў рыхтуецца з наступнымі песнямі: «Кума мая, кумачка», «Ой, сеяла Ульяніца лянок», «Як я была мала, мала», «Касіў Ясь канюшыну», «Дзяўчынанька, шуміць гай», «У месяцы верасні».

Падборка цікавая, песні прыгожыя і мілыя; жадаем як найбольш поспехаў спевакам і танцорам з гарадскога аддзела БГКТ. (вл)

Этнаграфічнае акенца



Вёска Рыбалы. Хата Мікалая Міхалюка, с. Васіля. Упрыгожанне з 1932 года. *Фота Я. Цялушэцкага.*

Пачатак на стар. 1

НАСТАЎНІК І САМАДЗЕЙНІК

Белавусах. Тут працуе ўжо 12 год. У гэтым годзе вучыць першы клас і вядзе ў старэйшых класах хімію. «Калега Казлоўскі не то што выдатны настаўнік, ён проста мастак педагагічнай справы». — сказала мне пані візітатар І. Сядлецкая.

БАКЦЫЛУ ЗАМІЛАВАННЯ ДА СЦЭНЫ

прывіла Э. Казлоўскаму колішняя пасляваенная гімназія у Янове. У ёй пад кіраўніцтвам дырэктара Анны Паўловіч гімназісты ставілі «Помсту» Фрэдры. З таго ўданага школьнага сцэнічнага дэбюту і пачаўся ў Э. Казлоўскага доўгі і плённы шлях самадзейніка. Прымаў ён удзел у пастаноўках на настаўніцкім курсе і ў камісіі па падрыхтоўцы настаўнікаў. Потым усюды там, дзе працаваў Э. Казлоўскі,

АБАВЯЗКОВА ПАЎСТАВАЎ ДРАМАТЫЧНЫ КАЛЕКТЫЎ.

У Праслаўцы ставяць «Помсту» Фрэдры, у Васілёўцы — «Такія часы» Юрандота, у Янове — «Пана Явяльскага» Фрэдры і «Імяніны пана дырэктара» Слатвінскага і Скаўронскага, у Красным — «Юбілей» Чэхава, у Белавусах «Юбілей» Чэхава, «Жаніцьбу» Гогаля і «Лекара міма волі» Мальера. Хоць і былі ў гэтай дзейнасці перапынкі, усё ж пастановак было многа, вельмі многа, асабліва, калі ўлічыць тое, што з некаторымі п'есамі самадзейнікі аб'язджалі амаль усе бліжэйшыя і далейшыя мясціны. Вядома, само сабой гатовенькім гэта не прыходзіла. Увесь свой вольны ад заняткаў у школе час Э. Казлоўскі прысвячаў працы з дарослай моладдзю. Хадзіў па хатах, размаўляў, пераконваў, заахвочваў. А калі сабраў патрэбную колькасць удзельнікаў, усю зіму працаваў з імі. Нялёгкая гэта была праца, і перашкодаў у ёй — не злічыць. Ні касцюмаў, ні рэквізітаў, ні сцэны, ні адпаведнага памяшкання — нічога не было. Але непераможная настойлівасць і вынаходлівасць Э. Казлоўскага над усім брала верх. Самадзейнікі самі сабе шылі касцюмы, майстравалі неабходныя рэквізіты і дэкарацыі, пазычалі па ўсім сяле дошкі на сцэну, а

ПАСТАНОЎКІ АДБЫВАЛІСЯ Ў СТАДОЛАХ.

Так, іменна ў стадолах. Вясною, калі гэтыя гаспадарчыя будынкі ў сяле пустуюць. Толькі тады, калі калектыву даводзілася выступаць у Саколцы, ён карыстаўся сапраўднай сцэнай, занавесам, кулісамі, залай з крэсламі.

— Што з'яўляецца маторам такой самаахвярнай дзейнасці Э. Казлоўскага? — запытае чытач.

Адказ тут вельмі просты: яго любоў да моладзі і мастацтва і жаданне даць вясковаму асяроддзю сапраўды культурную форму адпачынку і наблізіць да яго тэатр. Вось нават пад канец нашай размовы Э. Казлоўскі паведаміў, што цяпер марыць аб тым, каб за зіму падрыхтаваць са сваім калектывам штонебудзь з сучасных п'ес.

— Людзі ў нас любяць сцэнічнае мастацтва, цэняць яго і хочуць яго мець у сябе, тут, у сяле. Як жа ж можна ім гэта адмовіць? — заўважае ён.

Да гэтага мне больш нічога не застаецца дадаць, толькі пажадаць Эдуарду Казлоўскаму і ўсім падобным да яго дзеячам сельскай мастацкай самадзейнасці вялікіх поспехаў і задавальнення ў іх высакароднай працы.

Мікалай Гайдук



АДГАЛОСКІ

„У ДОБРЫ ЧАС"

Дзяржаўнае выдавецтва школьных падручнікаў у Варшаве выдала пад канец мінулага года новы падручнік беларускай мовы для 5 класа. Аўтарамі падручніка з'яўляюцца Лідзія і Мікалай Гайдукі — аўтарская суполка, вядомая ў нас ужо з цэлага шэрагу школьных падручнікаў. Папярэдні падручнік, якім да гэтага часу карысталіся вучні пятых класаў, быў таксама зроблены імі.

Новы падручнік пад агульным загалоўкам «У добры час» аўтары стараліся зрабіць больш сучасным, камунікатыўным, згодным з новай праграмай навучання. І гэта ім напэўна ўдалося.

Падручнік «У добры час» — кніжка не толькі для навукі чытання. У ёй можна знайсці значна шырэйшыя веды. Упершыню акрамя чытанак уведзены ў падручнік для пятага класа элементы граматыкі і тэорыі літаратуры. Прычым, галоўныя правілы марфалогіі і правапісу мовы выдзелены моцным шрыфтам, што значна аблягчае вучням паўтарэнне пройдзенага матэрыялу. Граматыка пададзена вельмі проста і даступна.

Нам у рэдакцыі не раз даводзілася сустракацца з вельмі маладымі, нават можна сказаць, малымі аўтарамі. Дзеці ўжо ў малодшых класах вельмі часта прабуюць пісаць вершы і нават мастацкія замалёўкі, наколькі ім гэта ўдаецца, прозай. Вядома, у гэтых «творах» выразна праяўляецца абсалютнае няведанне падставовых літаратурных форм і прынцыпаў. Таму з вялікім задавальненнем можна павітаць у новым падручніку першае ўвядзенне ў паняцце аб літаратурных формах. У новым падручніку ёсць такія тэмы, як «Празаічная і вершаваная мова», «Развіццё дзеяння ў літаратурным творы», «Страфічная пабудова верша», «Тэма і ідэя твора» і іншыя. Вучні пазнаёмяцца таксама з падставовымі элементамі граматыкі, правапісу і знойдуць у кніжцы шэраг вельмі карысных практыкаванняў.

Вельмі добра прадумана ў падручніку тэматыка чытанак. Адчыняюць падручнік два мілыя, спеўныя і простыя па форме вершы Артура Вольскага. Яны вітаюць вучня з пачаткам новага навучальнага года, змушаюць прадумаць змены, якія наступілі ў іх жыцці з пачаткам навукі, развіваюць у вучняў пачуццё любві да сваёй школы, мясцовасці і Радзімы. Далей у вершаванай ці празаічнай форме падаюцца падзеі мінуўшчыны, падкрэсліваецца дружба паміж польскім і савецкімі народамі. Аўтары звярнулі ўвагу на тое, каб вучні маглі паглыбляць свае веды аб класіках беларускай літаратуры, уводзячы кароткія даведкі аб іх і па некалькі твораў. Добра падабраны апавяданні і вершы да розных гадавін і дзяржаўных святаў. Напрыклад, да Дня Войска Польскага і да гадавіны Савецкай Арміі настаўнік, напэўна, выкарыстае апавяданне В. Хомчанкі «Па дарозе ў горад» ці верш «Наша Армія» А. Пархоменкі. Да Дня настаўніка — верш А. Вольскага «Настаўніца». Ёсць таксама матэрыялы аб Ул. Леніне і аб рэвалюцыі, аб міры і аб Варшаве, матэрыялы аб вялікіх людзях нашага мінулага — Георгію Скарыне і Кастусю Каліноўскім. Да гэтых матэрыялаў звярнуцца могуць не толькі настаўнікі пятых класаў. Іх можна выкарыстаць і на агульнашкольных вечарынах, прысвечаных асобным падзеям.

Значна больш увагі ў новым падручніку звернута на развіццё актыўнасці вучня яго самастойнага мышлення і працы. Гэтага дабіваюцца аўтары вельмі ўмела пастаўленымі заданнямі ў канцы чытанак. Дзякуючы гэтым заданням, вучні стараюцца глыбей зразумець сэнс чытанкі, яе ідэю і мараль, а затым атрымліваюць заданне знайсці падобныя з'явы вакол сябе, у сваім жыцці. Вельмі часта сустракаюцца такія заданні, як «Раскажыце, чым вам дарагая родная мясціна», «Якой павінна быць наша дружба» і іншыя. Значная ўвага звернута на самастойную працу над тэкстам — трэба скласці план апавядання, дзяліць яго на часткі, прыдумваць загалоўкі да іх, складаць тэматычныя слоўнічкі.

Дзеці пазнаюць правілы мастацкага чытання.

Усё гэта, разам узятае, стварае ў класе добрую, карысную забаву, якая вучыць многаму, вучыць пазнаваць свет, прычым на мове, роднай і блізкай дзіцяці.

Новы падручнік даволі вялікі. Узяўшы пад увагу скарочаныя праграмы, настаўнік атрымоўвае права шырокага ўласнага выбару матэрыялу згодна з узроўнем дзяцей, іх зацікаўленнямі і патрэбамі.

Такім чынам, ёсць новы, вельмі добры падручнік. Дык жадаем усім вучням шырокай дарогі ў краіну ведаў, у глыбейшае пазнаванне роднай мовы і літаратуры.

Яніна Чэрнякевіч



На купальным басейне ў пасёлку «Тысячагоддзя» Беластоцкага жыллёвага каапературыва плаваць вучацца перш за ўсё дзеці. *Фота Я. Цялушэцкага.*



ПЕРЫЯД XIX СТАГОДДЗЯ

ФЕЛІКС ТАПЧЭЎСКІ

Пісьменнік гэты з'яўляецца апошнім пісьменнікам XIX стагоддзя, аб якім мы хочам сказаць некалькі слоў. Гаварыць аб Тапчэўскім цяжка. Не ведаем даты яго нараджэння і яго смерці, не ведаем фактаў, звязаных з яго паходжаннем, перакананнямі, дзейнасцю. Няма аднак сумненняў, што пісаў ён у канцы XIX стагоддзя. Аб гэтым сведчаць элементы і дыскусіі ў творчасці Багушэвіча з творчасцю Тапчэўскага.

Праўдападобна, Тапчэўскі паходзіў з Усходняй Беларусі. Мабыць, як усе іншыя пісьменнікі XIX ст., выводзіўся са шляхты. Сваю творчасць аднак накіраваў супраць дваранства. Усё, што пісаў, было напісана ў імя інтарэсаў простага чалавека. Няма сумненняў, што быў ён шчырым дэмакратам і прыхільнікам грамадскага прагрэсу.

Фрагмент першага беларускага твора Тапчэўскага быў апублікаваны толькі ў 1915 годзе ў «Календары». Іншыя творы гэтага пісьменніка былі апублікаваны ў 12 нумары «Полымя» за 1954 год. Вялікія заслугі ў зборы і захаванні твораў Тапчэўскага меў вядомы энтузіяст беларускай культуры, мовы і літаратуры, прафесар Пецярбургскага універсітэта Браніслаў Эпімах-Шыпіла. На працягу многіх гадоў свайго жыцця прафесар складаў «Беларускую хрэстаматыю», у якой змяшчаў творы беларускіх пісьменнікаў XIX стагоддзя. Між іншым, у гэтай хрэстаматыі апынуліся творы Ф. Тапчэўскага: «Вечарынка», «Грошы і праца», «Панскае ігрышча», «Саўсім не тое, што было», «Ён і яна».

Мяркуюць, што вершы гэтыя былі напісаны Тапчэўскім у 1890 г. Калі прымем пад увагу тое, што першы зборнік Багушэвіча выйшаў у Кракаве ў 1891 годзе, дык акажацца, што Тапчэўскі і Багушэвіч тварылі бадай у адным часе. Зрэшты, Багушэвіч ва ўступе да свайго «Смыка беларускага» гаворыць, што ён чытаў вершы якогасьці Юркі. Справа ў гэтым, што Юрка або Хвэлька з Рукашэвіч гэта якраз Фелікс Тапчэўскі.

Багушэвіч заатакаваў верш Тапчэўскага «Панскае ігрышча», лічачы, што верш гэты не мае выразна акрэсленай антыцарскай тэндэнцыі. «Чытаў я, — піша Багушэвіч — і так перапісаныя вершы якогасьці Юркі «Панскае ігрышча», дзе Юрка надта дзівуецца і як бы завідуе панам тым, каторыя можа і больш ад Юркі таго працуюць, толькі ведама, вучоныя, дык лягчэй і спарней. ...Няхай выбачае Юрка, але, дальбог, аж злосць узяла, што Юрка спадабаў тое, што толькі блазну можа спадабацца. Я такі чыркнуў яму «Адказ», але так думаю, што гэта ён смеючыся з нашага цёмнага брата напісаў: гэтак думаў, што дурны мужык, дык ужо нічога не відзе і не знае!»

З гэтай палемікай Багушэвіча можна згаджацца і не згаджацца.

Думаю, што не зразумеў ён Тапчэўскага і таму закідае яму брак дэмакратызму. Факт, што «Панскае ігрышча» Юркі (Тапчэўскага) ўтрыманы ў спецыфічным духу. Селянін, выступаючы ў гэтым творы, адзначаецца поўнай шчырасцю. Напамінае ён крыху постаці беларускіх сялян з інтэрмедый або з творчасці Марцінкевіча. Мабыць, гэтая наіўнасць і не спадабалася Багушэвічу.

Тапчэўскі быў пісьменнікам монатэпным. Цікавіўся толькі адной праблемай — праблемай жыцця шляхты і сялянства. Гаворачы дакладней, цікавіла яго дэгенерацыя дваранства ў канцы XIX ст. Цікавіла яго нарастаючая капіталізацыя краіны і яе ўплыў на паўперызацыю жыцця народа. Характэрнай рысай творчасці Тапчэўскага было тое, што на рэчаіснасць, звязаную з жыццём дваранства і з капіталізацыяй краіны, стараўся глядзець вачамі селяніна. У гэтым праяўлялася і сіла і слабасць творчасці пісьменніка. Вершы яго, утрыманыя ў такім стылі, былі перакана ўчыя і наіўныя.

У вершы «Саўсім не тое, што было» Тапчэўскі вуснамі селяніна расказвае аб працэсе ўпадку шляхецкага слоя. Апавядае аб тым, як шляхта страціла сваю вядучую грамадскую пазіцыю, як страціла багацце і маёнткі, як перастала адыгрываць палітычную ролю ў краіне. Як з усяго прэсціжу, сілы і гордасці застаўся толькі пустазвонны шляхецкі гонар.

«Цяпер, як глянеш, сэрца млеець
На стары панскі экіпаж:
Хурман той ездзіць не ўмеець,
Лакеяў тых даўно нямаш;
Якіпажышка абарваны,
Граззю абмазаны кругом;
Падушкі мохам напіханы,
Чуць прыкрыт старым хвартухом.

...А ўсё ж па сажань тырчыць пуга,
Гапун, хоць чорны, а ўсё ж ёсць
І вожжы нацягнуты туга —

БЕЛАРУСКІЯ КНІГІ

У кнігарні ў Гайнаўцы, вул. 1 Мая 34, можна набыць наступныя кнігі на беларускай мове:

Хадкевіч Тарас, Мая Беларусь, 1968, стар. 176, цана 11 зл. 20 гр.

Гэтая кніга нарысаў належыць пяру сучаснага беларускага пісьменніка. Цікава і каларытна паказана ў ёй Беларусь палавіны 60-тых гадоў, вялікія стваральныя справы, дасягнутыя беларускім народам за 50 год Савецкай улады. Заводы і фабрыкі, калгасы і саўгасы, а перад усім — людзі — вось асноўная тэма гэтых нарысаў. Кніга выдадзена на высокім тэхнічным узроўні, багата аздоблена ілюстрацыямі, у тым ліку і каляровымі.

Рэкамендуем усім, хто цікавіцца сучаснай Беларуссю, яе гаспадаркай, культурай і жыццём савецкіх людзей.

Рылько Алесь, Выбранае, 1969, стар. 288, цана 6 зл. 10 гр.

Том выбраных апавяданняў беларускага пісьменніка, які ў беларускую літаратуру прыйшоў пасля вайны. У даваенны час ён быў настаўнікам, у ваенныя часы — партызанам-мінёрам. У яго творах чытач знойдзе рэалістычныя вобразы савецкіх людзей з іх высокімі маральнымі якасцямі. Кніга заканчваецца артыкулам пяра М. Пянкрата, прысвечаным жыццёваму і творчаму шляху А. Рылько.

Рэкамендуем усім любіцелям беларускай прозы.

Карпаў Уладзімір, Нямігі крывавыя берагі, 1972, стар. 480, цана 10 зл. 30 гр.

Гэты раман — першая частка тэтралогіі «На пераломе стагоддзя», у якую ўваходзяць «Нямігі крывавыя берагі», «За годам год», «Вясеннія ліўні» і «Сотая маладосць». Кожная з частак тэтралогіі з'яўляецца адначасова самастойным літаратурным творам. Раман «Нямігі крывавыя берагі» аўтар прысвяціў паказу барацьбы падпольшчыкаў, народных мсціўцаў-партызан і змаганням у мінскім гета ў часе Вялікай Айчыннай вайны.

Гэты салідны том добрай прозы рэкамендуем усім, хто цікавіцца гераічным змаганнем беларускага народа супраць фашысцкіх захопнікаў.

Машара Міхась, Вершы, 1971, стар. 416, цана 14 зл. 90 гр.

Зборнік твораў, напісаных у розныя гады жыцця вядомым беларускім пісьменнікам старэйшага пакалення Міхасём Машарам. Сваю літаратурную творчасць ён пачаў у 1927 г. Першы зборнік вершаў паэта «Малюнкі» выйшаў у 1928 г., калі ён знаходзіўся ў віленскай турме Лукішкі па прыгавору санацыйнага суда за ўдзел у рэвалюцыйным руху ў былой Заходняй Беларусі.

Гэты том паэзіі, паўстаўшай на працягу амаль паўстагоддзя актыўнага ўдзелу яе аўтара ў палітычным і грамадскім жыцці беларускага народа, рэкамендуем моладзі і старэйшым чытачам.

Пысін Аляксей, Пойма, 1971, стар. 336, цана 10 зл 10 гр.

Аднатомнік склалі выбраныя вершы і паэмы з розных год творчасці сучаснага беларускага паэта і журналіста з Магілёва, аўтара некалькі зборнікаў вершаў, а таксама твораў для дзяцей.


Рэкамендуем усім любіцелям беларускай сучаснай паэзіі.

Кнігарня ў Гайнаўцы ахвотна высылае кнігі за паштовым залічэннем (з далучэннем рахункаў, калі гэтага патрабуе пакупнік). Запатрабаванні кіруйце па адрасу:„Dom Książki", Hajnówka, ul. 1 Maja 34, woj. białostockie.

ФАЛЬКЛОР

ЛЮБОЎНАЯ





Коло млына вода мутна.
— Чого, моя міла, смутна?
— Я й нэ смутна, но сэрдіта,
Бо я была вночы біта.
— Я й нэ смутна, но сэрдіта,
Бо я была вночы біта.
Біла мэнэ мама вночы
За Іванка, чорны очы,
Шчэй казала будэ біті,
Коб Іванка нэ любіті.
Шчэй казала будэ біті,
Коб Іванка нэ любіті.
Я Іванка так мілую:
Дэ зобачу, там цілую.
Ой, Іванку, сэрцэ мое,
Нэма лепі, як нас двое.
Ой, Іванку, сэрцэ мое,
Нэма лепі, як нас двое.
А мне маті ворожыла:
Взяла тычку то й набіла,
Шчэй казала будэ біті,
Коб Іванка нэ любіті.
Шчэй казала будэ біті,
Коб Іванка нэ любіті.
Ой ты, мамка золотэнька,
Як ты была молодэнька,
Ты ходіла так за татком,
Як я й тэпэр за Іванком.
Ты ходіла так за татком,
Як я й тэпэр за Іванком.

Ад Марыі Парфенюк, 1951 года нараджэння, Ані Грыгарук, 1945 года нараджэння, і Ніны Грыц, 1952 года нараджэння, вёска Кленікі Гайнаўскага павету, запісаў 15 лістапада 1972 г. Мікалай Гайдук. З магнетафоннай стужкі нотны запіс зрабіў Эдуард Гойлік.

ПЕРАДАВЫ ГАСПАДАР

Ян Стасюлевіч з вёскі Кудраўка, што ў Дуброўскім павеце, гаспадарыць са сваёй жонкай на 12 га зямлі. Пабудаваў ён вялікія механізаваныя хлявы, у якіх трымае 12 штук быдла і больш 40 штук свіней. Кожны год ён прадае шмат тон мяса, шмат літраў малака. Мае ён свой уласны трактар і многа сельскагаспадарчых машын. Работы шмат, але і задавальнення многа і, зразумела, даходу. А калі што сялянам аплочваецца, дык агітаваць іх да гэтага не трэба.

Сын Стасюлевічаў вучыцца яшчэ ў пачатковай школе, але таксама нямала дапамагае бацькам. Ён плануе паступіць у сельскагаспадарчы тэхнікум у Ружаным Стоку і пасля яго заканчэння працаваць на гаспадарцы, выкарыстоўваючы навейшыя сельскагаспадарчыя веды. (мх)

Ці ведаеце, што...

...у Савецкім Саюзе новы навучальны год распачало 4,6 мільёнаў студэнтаў, у тым ліку больш 900 тысяч асоб на першым курсе.

*

...цяпер у Савецкім Саюзе налічваецца 819 вышэйшых навучальных устаноў. (ця)

Толькі скнара і лянівы не выпісвае „Ніву"

Знай нашых, знай, што мы авось!...»

Бадай што найбольш выразным у ідэйным сэнсе з'яўляецца верш Тапчэўскага «Грошы і праца». У гэтым творы аўтар займае выразную класавую пазіцыю. Становіцца на баку пакрыўджанага люду, даказвае, што пагарджаны селянін з'яўляецца галоўным стваральнікам усіх матэрыяльных вартасцей свету. Паслухайма фрагменту гэтага перакананаўчага не толькі ў змесце, але і ў форме твора.

«Кажуць: Мужык-хам, нецнота,
Гультай, шэльма, усё ліха!
А чыя ж гэта работа —
Хатка хлебіць і грачыха?
Хто разброіў лес на поле?
Абсушыў балоты, тоні
І для ўсіх зрабіў раздолле?
Усё ж гэта тыя хлопы,
Божы храм, карабль на моры,
І сабе грэблі і заборы,
І сабе мізэрны хаты,
Хто ж зрабіў, чыя работа?
Хто пацяў, ірваўшы жылле?
Той жа хам і той нецнота,
Што прazвалі паны быдла.»

Верш гэты да сёння прамаўляе сваёй унутранай праўдай. У гэтай трываласці ўздзеяння на чытача знаходзім элементы сапраўднага таленту Тапчэўскага.

ГМІНА Ў НОВЫМ ДВАРЫ

Гміна ў Новым Двары, што ў Дуброўскім павеце, невялікая. Належыць да яе 17 вёсак, у якіх налічваецца 1144 гаспадаркі і адзін ПГР. Былая грамадская рада нарадовая ў апошні год свайго існавання ўпершыню дабілася таго, што план куплі мінеральных угнаенняў быў выкананы ў 100% 31 мая 1972 года. Выкананы таксама план кантрактацыі зернавых культур. У вёсках на 20 планаваных сіласных ям пабудавана 27 і ёсць іх цяпер 98 штук. Парадзістых маладых свінаматак (на план 60 штук) дастаўлена гаспадарам 92. Горш з завядзеннем нізіннай чорна-белай (НЦБ) пароды кароў. На запатрабаваныя сялянамі 80 штук дастаўлена толькі 8 і зараз налічваецца тут 38 штук быдла пароды НЦБ.


На 100 га зямельных угоддзяў у канцы 1972 года прыпадала ў гэтай мясцовасці 42,6 кароў, 82,5 свіней, 33,9 авечак і 14,4 коней. Лікі гэтыя (апрача свіней) ніжэйшыя ад сярэдніх у павеце і ад сярэдніх у ваяводстве. Цягнуць назад усе гэтыя паказчыкі жыхары самой сядзібы гміны. Новы Двор — ні то вёска ні мястэчка, з 13 вуліцамі і з двума солтысамі; тут слаба ўгнойваюць зямлю і таму слабыя атрымліваюць ўраджаі, а яшчэ слабей развіваецца жывёлагадоўля. Новыя ўлады гміны, а перш за ўсё сельскагаспадарчая служба будзе мець тут шмат працы хаця б таму, што ў гміне налічваецца 106 эканамічна слабых гаспадарак, якія даюць мала сельскагаспадарчай прадукцыі. (мх)

З дапамогаю сялянам

Ашчадна-пазыковыя спулдзельні (СОП) нясуць вялікую дапамогу сялянам. Яны даюць трашовыя пазыкі на куплю мінеральных угнаенняў, лепшага гатунку быдла ці свіней, на пабудову дамоў і г.д. СОП у Орлі мае каля 1000 ашчадных кніжак, на іх знаходзіцца амаль 10 мільёнаў зл. Узначальвае СОП у Орлі Пётр Мартыновіч. Арлянскі СОП аказвае ўсебаковую дапамогу мясцоваму мастацкаму калектыву. (мх)



Міхал Матысюк з яшчэ гарачым хлебам, які зараз паедзе ў крамы.



Яраслаў Смактуновіч і Сцяпан Матыс ля хлебнай печы.

З маркай белавежскай пякарні

Пякарня ў Белавежы належыць да мясцовай гміннай спулдзельні. Хлебабулачнымі вырабамі забяспечвае яна Белавежу, хлеб давозяць таксама да пушчанскіх вёсак, таксама часткова да вёсак, якія належаць да ГС-у ў Гайнаўцы.

Кіраўнік пякарні Міхал Матысюк гаворыць, што пякарня ў суткі выпякае ў сярэднім каля 2 тон хлебабулачных вырабаў. Гэта не поўная магчымасць пякарні. Яна магла б даваць больш вырабаў, але пакуль што запатрабаванне абмежаванае.

Апрача хлебабулачнага, ёсць тут і аддзяленне здобных вырабаў. Тут пад кіраўніцтвам Раісы Полях смажаць смачныя пончыкі, пякуць макоўнікі, торты і іншыя смакалыкі. Аддзяленне здобных вырабаў дае 500—600 кілаграмаў прадукцыі ў месяц.

Тэкст і фота А. Карпюка

Жывёлагадоўля ў Хільмонах

Адным з галоўных заданняў сельскагаспадарчай вытворчасці з'яўляецца значнае павелічэнне быдла і свіней. У вёсцы Хільмоны ў Дуброўскім павеце свінагадоўля, можна сказаць, стаіць на рэкордным узроўні. На 100 га зямельных угоддзяў тут прыпадае 124,7 штук свіней. У мінулым годзе сярэдняя ваяводская колькасць свіней на 100 га зямлі акрэслівалася лікам 82,6 штук. Значыць, жыхары Хільмонаў па гадоўлі свіней ужо не толькі дасягнулі, але і значна перавысілі планы пяцігодкі і набліжаюцца да плану 1980 года.

Слабей ад свінагадоўлі развіваецца ў Хільмонах гадоўля быдла. Буйнай рагатай жывёлы на 100 га зямельных угоддзяў у павеце ў сярэднім прыпадала ў 1972 годзе 46 штук, у ваяводстве — 47,3 штук, а ў Хільмонах — 48,6. Значыць, паказчыкі і ў гэтай галіне добрыя, але могуць быць яшчэ лепшыя. І будуць, таму што сялянам аплочваецца гадаваць высокамалочных кароў і прадаваць малако дзяржаве. Гэта ж гарантуе кожны месяц па некалькі тысяч злотых. Аплочваецца таксама кантрактаваць маладняк і яловае быдла. І сялянам добра, і краіне. (мх)

Куток народнай памяці

У школе ў Валілах, у калідоры, на століку і сцяне зроблены мікрамузей. Тут ёсць здымкі людзей гэтай вёскі, якія прымалі ўдзел у абароне Польшчы ад нямецкіх захопнікаў у 1939 годзе, здымкі людзей, якія ў час акупацыі змагаліся з гітлераўцамі, медалі і здымкі людзей, якія змагаліся за станаўленне народнай улады. Апрача таго, ёсць там шмат экспанатаў, як мундзір савецкага салдата, асколкі бомбы, міны, салдацкія каскі, вайсковая карта і шмат іншых прадметаў. Гэта сапраўдны куток народнай памяці. Ды кніжка лягла сярод экспанатаў: «Гавораць загінуўшыя героі». Варта, каб кожная школа мела падобны куток народнай памяці. (мх)

ЛАТВІЙСКАЯ САВЕЦКАЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЯ РЭСПУБЛІКА

Латвійская ССР утворана 21 ліпеня 1940 г., увайшла ў Саюз ССР 5 жніўня 1940 г. Тэрыторыя — 63,7 тысяч кв. км, насельніцтва — 2 мільёны 409 тысяч чалавек. Сталіца Латвійскай ССР — горад Рыга.

Тэрыторыя Латвіі нізінная, у яе цэнтры знаходзіцца Сярэднелатвійская раўніна, а на ўсходзе — Відземскае ўзвышша, на захадзе ж — Курземская ўзвышша. Латвія мае шырокі доступ да мора (узбярэжжы Балтыйскага мора і Рыжскага заліву) і шэраг портаў, сярод якіх найбольшыя Рыга і Ліепая. У рэспубліцы каля 3 тысяч азёраў, яны займаюць каля 1,6 прац. тэрыторыі. Самая вялікая рака Латвіі — Даўгава (Заходняя Дзвіна). Клімат пераходны ад марскога да кантынентальнага.

Латвія багата будаўнічай сыравінай — даламітамі, вапнякамі, гіпсам, глінамі і пяскамі, а таксама торфам, запасы якога ацэньваюцца на 11,4 мільярда кубаметраў. На заходнім марскім узбярэжжы Латвіі адкрыты залежы нафты.

Латвійская ССР — індустрыяльная рэспубліка з развітай сельскай гаспадаркай. У яе прамысловасці вядучымі галінамі з'яўляюцца: электратэхніка, электроніка, радыётэхніка, прыладабудаванне, вагонабудаванне, суднабудаванне, выраб хімічна-фармацэўтычных рэчываў, апрацоўка драўніны. Побач з гэтай прадукцыяй шырока вядомы ва ўсім Савецкім Саюзе вырабы латвійскай лёгкай і спажывецкай прамысловасці: розныя віды трыкатажу, тканіны, галантарэя, мясныя і рыбныя кансервы. Колькасць гэтых вырабаў няспынна павялічваецца: у горадзе Огр узводзіцца адзін з найвялікшых у Еўропе прадзільна-трыкатажны камбінат, а ў Ліпені — вялікі камбінат галантарэйных вырабаў. Сельская гаспадарка Латвіі належна забяспечана сучаснай тэхнікай, праводзяцца вялікія працы па меліярацыі. Латвійская ССР спецыялізуецца ў гадоўлі малочнага і племяннога быдла, а таксама свіней на беконы.

Навуковыя даследаванні праводзяцца ў Акадэміі навук Латвійскай ССР і больш чым у 120 навукова-даследчых інстытутах, працуе 10 вышэйшых навучальных устаноў, 1137 агульнаадукацыйных школ розных відаў, 55 спецыяльных сярэдніх школ, выходзяць 174 газеты, часопісы і іншыя перыядычныя выданні. У рэспубліцы дзейнічае 10 прафесіянальных тэатраў, Рыжская кінастудыя, тэлестудыя, радыё. (мг)

ВЯЛІКІ КОНКУРС



Куток практычных ведаў



ЛЯДОЎКА — У КОЖНАЙ ХАЦЕ

У сучаснай вясковай хаце ўсё часцей мы бачым лядоўку (халадзільнік). Ці кожная аднак маладая гаспадыня (гаворым — маладая, бо старэйшыя вясковыя гаспадыні ў час сваёй маладосці аб чымсьці такім нават не чулі) ведае, як правільна карыстацца халадзільнікам?

А трэба ім умець карыстацца, каб не толькі не псаваліся паложаныя туды прадукты, але каб доўга і спраўна ён функцыянаваў.

Перш за ўсё ў лядоўцы неабходна ўтрымліваць аднолькава нізкую тэмпературу, паколькі ваганні, а асабліва павышэнне тэмпературы вышэй +8°C спрыяе псаванню прадуктаў. А трэба сказаць, што лядоўка не адсвяжае прадуктаў, а толькі стварае адпаведныя ўмовы для даўжэйшага перахоўвання прадуктаў у свежым стане.

Што рабіць, каб тэмпература ў халадзільніку была роўная? Перш за ўсё ніколі не ўстаўляць у яе гарачай стравы. Гарачую страву перад тым, як уставіць у лядоўку, трэба астудзіць. Дзверы лядоўкі адкрытымі трымаем нядоўга. Нельга таксама халадзільнік перагружаць. Сярэдзіну халадзільніка можна запоўніць у 50—75 працэнтах сырымі прадуктамі ці ў 25—50 працэнтах — гатовай стравай. Тады да ўсіх прадуктаў, паложаных у халадзільнік, будзе доступ халоднага паветра.

Неабходна таксама забяспечыць прадукты перад высыханнем. У высушаных прадуктах і стравах адбываюцца некарысныя змены ў выглядзе і смаку. Каб забяспечыць перад высыханнем прадукты, можна класці іх ў спецыяльны посуд з крышкаю, які прадукуецца спецыяльна для халадзільнікаў з жалезнай эмаліраванай бляхі. У такім посудзе можна перахоўваць мяса, рыбу, ну, і вараную страву. Такія прадукты, як каўбасы, тлушч, сыры, гародніну і фрукты, добра класці ў нейлонавыя мяшочкі, або васковую ці пергаментную паперу. Аднак лепш ужываць нейлонавыя мяшочкі, паколькі прыгадзяцца яны яшчэ не на адзін раз.

Неабходна таксама старанна загортваць прадукты, каб забяспечваць іх перад праніканнем розных запахаў. Некаторыя прадукты, як, напрыклад, малако, масла, сыры, вельмі лёгка ўпітваюць у сябе інтэнсіўныя запахі: напрыклад, цыбулі, капусты, рыбы, лімонаў і г.д. Таму гэтыя прадукты неабходна загортваць асабліва добра.

І яшчэ адно: лядоўка павінна быць заўсёды чыстая. Трэба таму ўважліва сачыць за чысцінёй прадуктаў, якія мы кладзем у яе, а таксама рэгулярна мыць яе.

Гаспадыня



КІЕЎ

Горад Кіеў — гэта трэці па велічыні горад Савецкага Саюза. Зараз ён налічвае звыш 1.650 000 жыхароў.

Аб Кіеве чытачы напэўна многа чулі. Але ёсць пагаворка: «Кіеў лепей адзін раз убачыць, чым сто разоў пра яго чуць». І гэта шчырая праўда.

Сталіца Савецкай Украіны ў вялікай пашане ў украінскага народу. Украінцы паўтараюць: — «Як тебе не любити, Києве мий».

Горад мае прыгожыя вуліцы, поўна зеляніны. Яна стварае цудоўны выгляд гораду і ачышчае паветра.

У Кіеве шырока разгорнута будаўніцтва жыллёвых дамоў. Штодзённа 70 сем'яў атрымлівае тут новыя кватэры. На 10.000 жыхароў прыпадае 85 лекараў. 50 000 студэнтаў вучыцца толькі ў Кіеўскім універсітэце і палітэхніцы. А ў Кіеве ёсць звыш 20 вышэйшых навучальных устаноў. У горадзе належна выконвае заданні транспарт. Перш за ўсё «метро». Кіеўскі транспарт штодзённа перавозіць звыш 2.000.000 пасажыраў.

У горадзе шмат помнікаў: У. І. Леніну, Героям паўстання, рабочым «Арсенала», змагарам за перамогу Кастрычніцкай рэвалюцыі, героя грамадзянскай вайны Н. А. Шчорсу, Міхалаю Астроўскаму, А. С. Пушкіну, Багдану Хмяльніцкаму, Тарасу Шаўчэнку, князю Уладзіміру і інш.

Ёсць планетарый, дзе можна паглядзець на штучным небе Сонца, Месяц і іншыя планеты, а, уключыўшы «Маятнік», пераканацца ў пастаяннай змене палажэння зямлі.

Выстаўка дасягненняў народнай гаспадаркі УССР — гэта сапраўды асобны горад, які мае свае вуліцы, плошчы, рэстараны, кіно і інш.

Кіева не памілаваў страшэнны ўраган другой сусветнай вайны. Гітлераўцы разбурылі звыш 1000 прадпрыемстваў. Знішчылі 6.000 дамоў. Аграбілі фабрыкі і заводы. Вывезлі ў Германію запасы сыравіны і прадуктаў харчавання. Узарвалі Успенскі сабор Кіева-Пячэрскай лаўры. Забілі каля 200 тыс. жыхароў і на катаргу ў Германію вывезлі звыш 100 тыс. кіяўлян.

Адступаючы на захад, фашысты ўмацаваліся ў Кіеве на выгадных для іх пазіцыях, выкарыстоўваючы натуральныя вышыні, на якіх стаіць горад. З увагі на гэта, аказалася немагчымым узяць горад з ходу. Пачаліся жорсткія баі за вызваленне горада. Раніцай 6 лістапада 1943 года Кіеў быў вызвалены.


На франтах яшчэ ішлі баі, а кіяўляне ўжо ўзяліся за адбудову горада. Пры дапамозе ўсіх народаў Савецкага Саюза і ў сталіцы Украіны былі залечаны ваенныя раны.

У Парку Вечнай Славы ў гонар воінаў Вялікай Айчыннай вайны пабудаваны манумент-абеліск з цёмнашэрага паліраванага граніту. Падняўся ён у неба 26-метровай вышынёй.

Ля падножжа гэтага помніка ёсць магіла Невядомага салдата. На ёй гарыць непагасны агонь, як той агонь любві да Айчыны, які палыхаў у сэрцах адважных абаронцаў радзімай зямлі.

У парку пахаваны 34 героі Айчыннай вайны. Над іх магіламі ціха шалясцяць лісці тапаляў, каштанаў, клёнаў. Героі спяць вечным сном пад калыханку жалобнай мелодыі, якая чуецца ўдзень і ўночы па ўсяму цудоўнаму кіеўскаму парку, наводзячы ўспамін мінулага.

Уладзімір Навіцкі.



Помнік Т. Шаўчэнку ў Кіеве.



Дні міналі за днямі, яны прыносілі Кноблаху ўсё, пра што можа толькі марыць салдат, які не знаходзіцца ў водпуску. Яму дазвалялі спаць, колькі хочацца, есці і піць, колькі ўлезе. Пасля снедання ён выходзіў на шпацыр, вечарамі глядзеў кінафільмы. Адзінае, што яму давялося рабіць, гэта расказваць якой-небудзь новай групе афіцэраў пра Грэльхамера і яго войска. Аднойчы яго слухалі высокапастаўлены эсэсаўскі афіцэр і лейтэнант авіяцыі. Абодва схіліліся над картамі, панатыкалі ў іх сцяжкі. Нарэшце лётчык сказаў:

— Гэта можна зрабіць на «Фоке-Вульфе 290». Ніякая іншая машына з гэткім грузам такую адлегласць не пераадолее.

— Я раздабуду вам «Фоке-Вульф», — паабяцаў эсэсаўскі афіцэр. — У ноч на суботу пачнецца аперацыя «Бумеранг».

Афіцэр-эсэсавец адчуваў амаль тое ж, што і генерал. Ён, чалавек, які безліч разоў засылаў у тыл Чырвонай Арміі сакрэтных агентаў і дыверсантаў, убачыў цяпер рэальную магчымасць зноў перайсці ад дробных акцый, якімі яму даводзілася займацца апошні месяц, да буйных аперацый.

— Цяжкавата будзе дастаць самалёт, — сказаў ён на развітанне лётчыку, — але так ці інакш ён у вас будзе.

Кноблах чуў гэтыя словы і вельмі ўзрадаваўся. Ён пільна разглядаў эсэсаўскага начальніка, на шыі якога паблісківаў крыж, і падумаў: «Калі такі чалавек бярэцца за справу, перашкод не існуе».

На наступны дзень у нарадзе прыняў удзел нейкі обер-лейтэнант і фельдфебель, і Кноблаху зноў давялося расказваць усё спачатку, але на гэты раз ужо ва ўсіх дэталях. Альтэнкірха — так звалі обер-лейтэнанта — цікавіў кожны куст, кожная лагчына паблізу ад таго ўскрайку лесу, дзе двойчы на тыдзень будзе чакаць обер-лейтэнант Вайтхазе.

— Обер-лейтэнант прыйдзе адзін? — запытаў Альтэнкірх.

— Гэта не выключана, — адказаў Кноблах. — Магчыма, адзін. А магчыма з двума-трыма салдатамі.

— Дрэнна, што вы гэтага не ведаеце. З Вайтхазе вы знаёмы?

— Не, — сказаў Кноблах.

— Кепска. Іменна мне давядзецца шукаць яго. Я спушчуся на парашуце ў ноч на суботу.

— Ах, так! — прамовіў Кноблах і пачаў больш уважліва прыглядацца да обер-лейтэнанта — пазіраў на яго доўгі, худы, крыху скошаны наперад твар, невялічкую галаву з рэдкімі, зачэсанымі простым праборам валасамі, худымі скуламі, на якіх відаць было, як варушацца косці, калі ён гаварыў.

— Што ж, жадаю поспеху, — сказаў Кноблах.

— Дзякую. А вам жадаю добра правабіць час у водпуску.

Кноблах падзякаваў яму, папрасіў дазволу ісці і выйшаў. Ён зрабіў усё, што мог, сказаў усё, што мусіў. Цяпер ён адчуваў сябе больш знясіленым, чым тады, калі прабіраўся да лініі фронту, хоць апошнія дні ўдосталь еў і многа спаў. Ніколі, ён быў упэўнены, не забудзе ён ніводнай гадзіны гэтых дзён.

Тым жа вечарам Кноблах паехаў дадому, да сваёй жонкі. Тое, што адбылося пасля гэтага, рабілася ўжо без яго.

Галоўная роля перайшла цяпер да обер-лейтэнанта Альтэнкірха. Яму было 26 год. Сем гадоў ён праслужыў у вермахце і ўжо два гады, як стаў афіцэрам. Ён глядзеў на карту, на якой відаць былі лясныя масівы на поўнач ад Віцебска, і спрабаваў добра разабрацца ў самім сябе, зразумець, чаму ён сам добраахвотна выклікаўся ўдзельнічаць у гэтай дэсантнай аперацыі. Гаварыў сабе: «Калі ўсё пойдзе добра, я атрымаю «Рыцарскі крыж». Ці вялікія шанцы на ўдачу, загадзя сказаць было нельга, таму што яму вядома было мала фактараў. Урэшце, якое значэнне мае, колькі ёсць працэнтаў шанцаў на поспех, адзін, два ці тры, — астатнія, да сотні, усё роўна азначае разбітую пры прызямленні патыліцу, аўтаматную кулю з кустоў, смерць ад голаду ці холаду або ад якой хваробы. «Тысяча пяцьсот салдат і афіцэраў, — падумаў Альтэнкірх. — Гэта ўсё ж такі што-небудзь значыць».

Альтэнкірх не адрываў позірку ад карты, хоць і разумеў, што няма ніякага сэнсу ламаць сабе галаву, загадзя стараючыся прадбачыць будучае. У яго былі рэальныя клопаты — шмат чаго трэба было зрабіць за гэтыя дні: параіцца з лётчыкам наконт кожнага кілаграма грузу, які неабходна перакінуць праз пяцьсот кіламетраў, абмеркаваць усё са сваім радыстам, оберфенрыхам Будэрам.

— Паслухайце, — аднойчы сказаў яму эсэсаўскі афіцэр, — у мяне ёсць для вас навіна: вы возьмеце з сабой рускага, старшага лейтэнанта Чырвонай Арміі.

Альтэнкірх вылупіў вочы.

— Так, — гаварыў далей эсэсавец. — Уласаўца. Вы чулі што-небудзь пра генерала Уласава? Яго ўзялі ў палон на Волхаве, і ён сфарміраваў дывізію з людзей, якія незадаволены Саветамі. Гэтага чалавека я прывёз ад яго. Някепска гаворыць па-нямецку, будзе вам памагаць.

Альтэнкірх падумаў: «Значыць, здраднік. Чалавек, які прадаў сваіх, а цяпер служыць нам». Нейкае трывожнае пачуццё апанавала яго. Захацелася запярэчыць супраць мэтазгоднасці мець такога спадарожніка, але ніводзін пераканаўчы довад у галаву не прыходзіў.

— Выдатная ідэя, — гаварыў эсэсаўскі афіцэр. — Мы забяспечым вас рускімі грашыма, і гэты чалавек будзе купляць вам харч у вёсках. Да таго ж, ён можа здабыць важныя весткі.

ТРЫБУНА чытачоў

ЗІМА

Ужо астыла на двары
І стала зімна ў полі.
Дзьмуць ужо халодныя вятры,
Калышуцца таполі.

Зямлю пакрыў ужо першы снег,
Скаваў мароз ўсе рэкі.
Чуваць вясёлы смех дзяцей
На лёдзе ля пасекі.

Звярам і птушкам вельмі дрэнна,
Не маюць корму ўжо тады,
А дзеці кормяць іх штодзённа,
Гэта іх добрыя сябры.

Зімой у лесе многа снегу
І вельмі ціха ў лесе тым.
Хлопцы на нартах у лес едуць
І гэтым цешацца яны.

Янка Грыгарук, Галады.



ПЕРАСЦЯРОГА

Раз прышлося мне, браточкі,
За гародам пасць каровы.
Бачу, матацыкл імчыцца,
А на ім хлапец вясёлы.

Прыглядаюся і бачу:
Мой знакомы то ж з Бялок.
Матацыкал акірачыў,
Ездзіць, як той абібок.

«Ты чаго, — крычу, — Мікола,
Шчэ й з арлом, нібы салдат?
Адчапі з цывільнай шапкі,
Бо улепіць хто мандат».


«Я прыехаў не дарэмна —
Матар'ял сабраць ў Парнас.
Прачытаеце ў газеце,
Напішу я і пра вас».

І сапраўды напісаў ён
Ды з абразай для мнагіх,
Успамінуў усіх парадкі
Не убачыўшы сваіх.

Што ж, сяляне нашай вёскі
Звыклі лаянкі прымаць,
Ну і просяць, каб Парнасік
Мог яму пераказаць:

За абразу і лінагуза
Асцярожным, братка, будзь,
Бо заробіш на лоб гуза,
А мо і лепша што-небудзь.

Мікалай Краўчук, Патока



ДАРАГОЕ «СЭРЦАЙКА»!

З Віктарам сябрую я амаль год. Спачатку гэта было звычайнае сяброўства, але потым перайшло яно ў каханне. Гаварылі мы нават ужо аб жаніцьбе, толькі што мы яшчэ маладыя: мне 18 год, а майму хлопцу 19. Ён вясною пойдзе да войска, ды і закон не дазваляе хлопцу жаніцца, пакуль не споўніцца яму 21 год. Мы перажывалі, што так доўга трэба будзе чакаць, але вось нядаўна Віктар зрабіў мне такую прыкрасць, што я і задаволена цяпер, што мы не пажаніліся, і думаю, ці не парваць з ім назаўсёды, бо я не змагу прабачыць яму гэтага.

А было гэта так. Мая сяброўка, якая жыве ў горадзе, запрасіла нас (мяне і Віктара) на Сільвестравы вечар да сябе. Мы ахвотна паехалі. Мяне цікавіла гэта, бо яшчэ ніколі на такім вечары я не была. Была гэта так званая «прыватка». Прыйшло шмат хлопцаў і дзяўчат, вельмі весела і прыемна правялі мы гэты вечар. Ад'язджаючы з дому, я паабяцала бацькам, што вярнуся дамоў раніцай першым цягніком. Віктар таксама на гэта згадзіўся. І калі я сказала яму, што ўжо пойдзем, ён пачаў падгаварваць мяне, каб застацца, што няма чаго спяшацца дадому. А я ведаю, што калі б я яго паслухала і вярнулася пазней, бацькі мае непакоіліся б за мяне, не ведаючы, што здарылася. І таму я цвёрда пастанавіла ехаць, так як абяцала бацькам. Праўда, Віктар правёў мяне да цягніка — гэта было недалёка, паколькі сяброўка жыве недалёка ад вакзала. Але ехаць са мной не захацеў і вярнуўся назад. Мне было вельмі прыкра. А як ты, «Сэрцайка», ацэніш паступак майго хлопца?

Галіна з Беласточчыны

Галіна! Безумоўна, хлопец твой паступіў брыдка. Вы разам прыйшлі і павінны былі разам вярнуцца, тым больш, што паабяцалі бацькам і Віктар на гэта згадзіўся. А і шампанскае тут не без віны, мала ж гэта ўсялякіх прыкрасцей праз гарэлку? Але думаю, што Віктар зразумее сваю памылку і будзе старацца яе направіць. Праз гэта парваць назаўсёды? Надта востра ставіш справу. А вы ж аб замужастве гаварылі! І вось гэты факт з'яўляецца якраз доказам, што не дараслі вы яшчэ да гэтага, і спяшацца няма чаго. У жыцці ж усяляк бывае. Час пакажа, ці вашы пачуцці сапраўды трывалыя, ды і лепш пазнаеце адзін другога.

«Сэрцайка»

Тэлефон для вёскі

Паводле планаў Міністэрства сувязі, прадбачваецца да канца 1975 года падключыць да тэлефоннай сеці 11,5 тыс. вёсак. Тэлефон будзе ў кожнага солтыса, а карыстацца ім змогуць жыхары гэтых вёсак.

Бельскі РУТ у мінулым годзе правёў тэлефоны ў 50 салэцтвах, хаця планавалася толькі ў 48. У тым ліку атрымалі тэлефоны 33 мясцовасці ў Бельскім павеце, 9 — у Гайнаўскім і 8 — у Сямяцічкім. Такім чынам, у раёне гэтай установы (ахоплівае яна 3 паветы) ужо 76 вёсак маюць тэлефоны.


Як сцвярджае дырэктар бельскага РУТ-у, тэлефанізацыя вёсак скароціцца на цэлы год і будзе закончана ў канцы 1974 года. (мх)

Кансультацыя юрыста

ПЫТАННЕ: Выязджаючы ў іншае месца А. пакінуў мне і сваёй сястры драўляны дом з пляцам. Мы спісалі толькі ўмовы арэнды на 99 год у форме прыватнай. Тры гады таму назад я разабраў гэты дом, бо ён развальваўся і пабудаваў новы дом у чатыры пакоі, з якіх адзін займае сястра гр. А. Чыёй уласнасцю з'яўляецца гэты дом і якія правы прыслугоўвалі б мне, калі б я хацеў аддзяліцца ад сястры А.?

АДКАЗ: Умовы арэнды на 99 год лічацца ў практыцы як умовы продажу. Аднак у вашым выпадку, паколькі ўмова не заключана ў форме натарыяльнай, вы не маглі набыць уласнасці пляцу і дома. Паколькі гэта гарадская нерухомая маёмасць, не адносіцца да яе закон з 26 кастрычніка 1971 г. аб урэгуляванні ўласнасці сельскай гаспадаркі, значыць, пляц застанецца надалей уласнасцю А., а вы супольна з яго сястрой з'яўляецеся карыстальнікам. Дом, які вы пабудавалі, з'яўляецца ўласнасцю А., г. зн. уласніка пляцу, на якім ён пабудаваны, а вы можаце патрабаваць звароту выдаткаў на будову дому, але толькі тады, калі б вы пераехалі на новую кватэру.

Можна аднак дамагацца праз суд перанясення на вас супольна з сястрой уласніка ўласнасці пляцу, калі вартасць дома значна перавышае вартасць пляцу. Толькі пасля гэтага можна было б выступіць з просьбай аб падзеле супольнай уласнасці і тады суд разлічыў бы выдаткі на пабудову дома як вашы, так і сястры былога ўласніка.



Школа ў Белавусах. *Фота — М. Гайдука.*

— А што калі ён здрадзіць?

— Не здрадзіць. Ён вельмі добра ведае, што калі Саветы схопяць яго, дык у наступнае ж імгненне паставяць да сцяны. Прозвішча яго Мартынаў.

Альтэнкірх убачыў Мартынава толькі перад самым вылетам у бараку на краі аэрадрома.

— Хачу пазнаёміць вас і растлумачыць вашы адносіны, — сказаў эсэсавец ледзяным тонам, бо хацеў паказаць ім, што лічыць сябе вышэй за іх, што яны толькі сляпая зброя ў яго руках. — На час гэтай аперацыі обер-лейтэнант Альтэнкірх будзе вашым начальнікам, пан Мартынаў.

Рускі злёгку пакланіўся Альтэнкірху, і той ад неспадзеўкі адказаў яму тым жа.

— Думаю, — прамовіў Альтэнкірх, каб толькі што-небудзь сказаць, — мы з вамі добра паладзім.

— Я ўпэўнены, — адказаў рускі.

Ён стаяў ля стала, на якім ляжаў яго рыштунак — парашут, рукзак, аўтамат і некалькі сумак. На твары не прамільгнула і ценю якога-небудзь унутранага парыву — ні калі гаварыў, ні цяпер, калі маўчаў. Гэта маўчанне гняло астатніх. Яны маглі прымусіць рускага таварыць, толькі ўцягнуўшы яго ў размову, але не ведалі, як гэта зрабіць. «Гэта толькі ж той, — падумаў Альтэнкірх, — каго мы называем ніжэйшай істотай, расава непаўнацэнны чалавек, які не заслугоўвае таго, каб сядзець з арыйцам за адным сталом. Але нам з ім давядзецца есці з аднаго кацялка, зацягвацца дымам адной цыгарэты...»

— Чорт вазьмі! — усклікнуў Альтэнкірх. — Калі ўжо тая скрыня паляціць? Колькі часу нам яшчэ тут аціраццa?

— Пан Альтэнкірх, — прамовіў эсэсавец, — заданне вам ясна? «Аперацыя «БУМЕРАНГ» пачынаецца. Пастарайцеся разам з вашымі людзьмі зрабіць усё як найлепш. Хайль Гітлер!

— Хайль! — Альтэнкірх выцягнуўся і ўзняў руку. Ён пачуў, як цокнуліся адзін аб адзін абцасы Будэра. Альтэнкірху вельмі хацелася ўбачыць выраз твару рускага, але ён не адважыўся павярнуцца ў яго бок і ўтаропіўся проста ў спіну эсэсаўскага начальніка, пакуль той не выйшаў, і толькі тады павярнуўся да рускага. На твары Мартынава не відаць было ніякіх перамен — ён быў такі ж, як і раней: абыякавы, спакойны. Тады Альтэнкірх выхапіў з сумкі бутэльку з каньяком, зрабіў глыбокі глыток і перадаў Будэру. Той сеў і пачаў піць — піў доўга, і Альтэнкірха пачало ўжо мучыць пытанне, ці аддасць ён бутэльку назад альбо зробіць тое, што павінен быў зрабіць, хоць і нехаця, у гэтай сітуацыі.

Будэр паставіў бутэльку на стол, абцёр тыльным бокам рукі рыльца і перадаў рускаму.

— Піце, — сказаў ён.

Мартынаў узяў бутэльку, сказаў: — Дзякуй, — і адпіў глыток.

— Ну, хлопцы, — прамовіў Альтэнкірх, — адпраўляемся!

На душы ў яго стала лягчэй. Чаканне скончылася, а галоўнае — скончылася гэта агіднае становішча. «Дурныя эсэсаўскія бонзы, — падумаў ён. — Я б ахватней паляцеў без гэтага ўпартага казла — мёртвы рускі мне больш падабаецца, чым жывы, але, калі давodзіцца ўжо супрацоўнічаць з імі, трэба стрымліваць свае пачуцці».

(Працяг будзе).

Няслаўная хроніка

■ 3.I.73 г. у Наройках Сямяціцкага павету згарэла клуня Леаніда Алешчука. Страты каля 60 000 зл. Пажар узнік у выніку дрэннай электраўстаноўкі.

■ 3.I.73 г. у Бельску Ян Парафіновіч (77 год), едучы самаходам, ударыў у бетонны слуп на вуліцы Спартовай. У выніку гэтага Марыя Парадовіч, якая была ў самаходзе, зламала нагу.

■ 5.I.73 г. на шашы паблізу Васількова грузавік, які вёў Мікалай Карасюк (39 год) з Беластока, на слізкай дарозе вывернуўся ў роў. У выніку дыспанент самахода Базыль Маслюк (36 год) быў цяжка паранены і трапіў у шпіталь. Самаход пашкоджаны амаль на 15 тыс. зл.



М. Ляўчук, в. Новае Ляўкова 3. Як паведамілі нам у Ваяводскім інспектараце забеспячэння вёскі вадою і электрыфікацыі Прэзідыума ВРН у Беластоку, адказ вы ўжо павінны былі атрымаць.

У. Гедзіч, в. Баброўнікі. Каб за 100 кілаграмаў грэчкі атрымаць 825 зл., яна павінна мець не больш 15—16% вільгаці і другую ступень чыстасці, гэта значыць, найбольш 5% забруджванняў ужытэчных і неўжытэчных, у тым ліку неўжытэчных забруджванняў не больш як 3%. У вашым выпадку грэчка мела 20,9% вільгаці і з-за гэтага вы не атрымалі поўнай цаны. Як нас праінфармавалі ў ВЗГС у Беластоку, за кожны 1% вышэй 18% вільгаці вылічаецца па 2% з агульнай цаны за адзін цэнтнер збожжавых культур.

КІНО

ГАЙНАЎСКІ ПАВЕТ

Кляшчэлі
„Giuseppe w Warszawie" (polski), 30—31. „Królewski błąd" (czeski), 1—2. II. „Śmierć Ipu" (rumuński), 3—4. II.

Нараўка
„Pamiętnik szalonej gospodyni" (USA), „Bitwa o Kozi Dwór" (polski), 31. I.—4. II.

Нарва
„Wujaszek Wania" (radz.), „Wojenka, wojenka" (węgierski), 31. I —4. II.

Чыжы
„Kupujemy wóz strażacki" (NRD), „Testament Agi" (węgierski), 31. I—4. II.

Дубічы Царкоўныя
„Przygody misia Yogi" (USA), „Przystań" (polski), 31. I.—4. II.

Арэшкава
„Tylko jeden telefon" (węgierski), „Królowa stacji benzynowej" (radz.), 3—4. II.

БЕЛЬСКІ ПАВЕТ

Боцькі
„Seksolatki" (polski), „Kaukazka branka" (radz.), 31. I.—4. II.

Орля
„Agent Nr 1" (polski), „Jaskółki" (węgierski), 31. I.—4. II.

Райск
„Oficerowie" (radz.), „Umrzeć z miłości" (franc.), 31. I.—4. II.

САКОЛЬСКІ ПАВЕТ

Крынкі
„Zwariowana noc" (polski), 30—31. I. „Lekcja odwagi" (czeski), 1—2. II. „Szczęście Anny" (radz.), 3—4. II.

Шудзялава
„Zbrodnia i kara" (radz.), „Trzy kroki po ziemi" (polski), 31. I.—4. II.

Янаў
„12 krzeseł" (radz.), „Ostatnia gra Karina" (węgierski), 31. I.—4. II.

СЯМЯЦІЦКІ ПАВЕТ

Нурэц
„Ostatni watażka" (bułg.), 30. I.—31. I. „Małżeństwo roku II" (rumuński), 1—2. II. „Ballada o Cable'u Hoguoe'u (USA), 3—4.

Мельнік
„Wielka miłość" (franc.), 30—31. I. „Kochany drapieżnik" (radz.), 1—2. II. „Krzyżacy" (polski), 3—4. II.

Мілейчыцы
„Zwariowałeś Toni" (czeski), 30—31. I. „Małżeństwo roku II" (rumuński), 1—2. II. „Ballada o Cable'u Hoguoe'u (USA), 3—4. II.

ДУБРОЎСКІ ПАВЕТ

Сухаволя
„Pilot helikoptera" (rumuński), „Sokoły" (węgierski), 3—4. II.

Новы Двор
„Kamo znany osobiście" (radz.), „Kamo niebezpieczna misja" (radz.), 31. I.—4. II.

Ніва

Organ Zarządu Głównego Białoruskiego Towarzystwa Społeczno-Kulturalnego

Adres redakcji: Białystok, ul. Wesołowskiego 1, Telefony: red. naczelny 2-10-33, centrala 2-32-41 do 45. Warunki prenumeraty: miesięcznie — 2,40 zł, kwartalnie — 7,20 zł, półrocznie — 14,40 zł, rocznie — 28,80 zł. Prenumeratę przyjmują wszystkie placówki pocztowe i listonosze. Wpłaty na prenumeratę indywidualną należy dokonywać na konto PUPiK „Ruch" Nr 102-7-161 NBP Białystok I Oddział Miejski. Na odwrocie blankietu należy podać okres prenumeraty i tytuł zamawianego pisma. Zamówienia ze zleceniem wysyłki za granicę przyjmuje — Przedsiębiorstwo Kolportażu Wydawnictw Zagranicznych „Ruch" Warszawa, ul. Wronia 23. Nr konta PKO 1-6-100024. Zamówienia z krajów europejskich jak i zamorskich należy kierować pod adresem Przedsiębiorstwo Kolportażu Wydawnictw Zagranicznych „Ruch", Warszawa, ul. Wronia 23.

BZGraf. Nakład 7.410 K-1

ДЭФІЦЫТНЫ ТАВАР

Спачатку я спрабаваў праскочыць без чаргі. Працiснуўся да прылаўка, усім сваім выглядам паказваючы, што я не пакупнік. Што, быццам, мне толькі глянуць, за чым людзі таўкуцца.

Гэты манеўр бліскуча ўдаўся.

Далей бачком-бачком непрыкметна зацясаўся паміж тых, што стаялі каля прылаўка першымі. Нібы я тут і нарадзіўся. Нават сам пагукваць пачаў:

— Не таўпіцца, грамадзяне, не таўпіцца!

Бо моцна націскалі з бакоў.

Але тут мяне выкрылі і выкінулі прэч, адараўшы пры гэтым два гузікі і добра намяўшы бакі.

Канец чаргі я знайшоў недзе за паўквартала ад магазіна.

Чарга пасоўвалася памалу. Я прытрымліваў рукамі полы паліто і прытанцоўваў на месцы, намагаючыся сагрэцца.

На душы было неспакойна. «Хопіць ці не хопіць?» — гэтае пытанне хвалявала ўсіх.

— Па колькі ў адны рукі даюць? — перапытвалі адзін аднаго.

— Кажуць, каб патроху...

Некалькі разоў нехта пускаў чутку, што тавар скончыўся, і тады пачыналася мітусня і штурханіна. Чарга ламалася, а за некалькі хвілін рыхтавалася зноў. Доўга высвятлялася, хто за кім. Тыя, што стаялі ззаду, нейкім чынам апынуліся спераду і не хацелі нікога прызнаваць.

Паклікалі міліцыянера, каб навёў парадак. Я сам злавіў нейкага малойчыка, што намагаўся праслізнуць у магазін. І хоць ён апраўдваўся: «Я хацеў толькі глянуць!» — я перадаў яго міліцыянеру. Няхай не лезе, нахабнік!

Тым часам я прасунуўся наперад больш як напалавіну. Але чарга не змяншылася. Канец яе быў на тым жа месцы, што і дзве гадзіны таму. Чэргі маюць свае законы ўтварэння...

Калі я быў ужо за некалькі крокаў ад мэты, тавар сапраўды скончыўся, у чым кожны хацеў пераканацца на ўласныя вочы. Задніх налягалі, пярэднія сунулі ім насустрач.

Я апынуўся пасярэдзіне. Мне адарвалі рэшту гузікаў. У чэргах мне заўсёды не шанцуе..

Затое неспадзявана пашанцавала на вуліцы. У нейкага дзядзькі з-пад палы я прыдбаў тое, за чым так біўся: поўны запалкавы пачак матылёў.

В. Каваль

Акрэсленая думка.

НІЎКА

А гэта найлепшыя экземпляры маёй калекцыі.

Талаваломка

Злучыце абедзве кветкі непарыўнай лініяй так, каб яна праходзіла па ўсіх клетках рысунка, не перасякаючыся.

Адказ на заданне з папярэдняга нумара:

БЯДА

Калегі наведваюць у бальніцы хворага супрацоўніка.

— У вас цяпер прыбавілася работы? — слабым голасам пытаецца ён.

— Не хвалюйся, стары, усё ў парадку. Мы вырашылі падзяліць тваю работу паміж сабой. Бяда толькі ў тым, што мы ніяк не можам успомніць, што ж ты, уласна, рабіў?

Паставілі і пасадзілі

Каб кіраваць харчовым складам,
Шукалі доўга дабрадзея.
І вось прызначылі Аўдзея,
Афармілі, як след, загадам.
— Ці выцягнеш? — Аўдзея
запыталі,
Калі з пасадай віншавалі.
— Нічога, выцягну, — сказаў
Аўдзей, —
Такіх, як вы, не падвяду людзей...
Чакаць нядоўга давялося.
Як ён сказаў, так і збылося.
Спачатку выцягнуў вяндліну,
Затым бараніну, свініну...
Хоць не адразу — паступова
Трымаў ён дадзенае слова.

Вось так хапузе удружылі —
Паставілі, а потым пасадзілі.

Сямён Пацёмкін

— *Давайце, я памагу вам навучыцца катацца.*

— *Дзякую. Я пакуль так пакатаюся, а потым падымуся на ногі.*

У ФРАНЦЫІ

Вядомы зарубежны кінаартыст і рэжысёр дае турыстам параду, як трэба пераходзіць вуліцу, не падвяргаючы небяспецы сваё жыццё:

«У Італіі пераходзьце вуліцу пад руку з якой-небудзь бландзінкай. У Англіі пры пераходзе вядзіце на павадку сабаку. У ЗША глядзіце, каб вас суправаджала не менш трох дзяцей. У ФРГ, пераходзячы вуліцу, майце на сабе генеральскі мундзір. А ў Францыі, калі вам дарагое жыццё, наогул не пераходзьце вуліцы».

ЛАГІЧНЫ ДОВАД

— З якой гэта нагоды ты сёння выпіў?

— Зарплата была.

— І абавязкова з зарплаты трэба выпіць?

— Чаму абавязкова? Не абавязкова. Але калі б я не выпіў з выпадку зарплаты, жонка нізашто б не паверыла.

ЯКАЯ РОЗНІЦА

Дзяўчына пытае ў свайго любага:

— Якая розніца паміж мною і гадзіннікам?

— Гадзіннік паказвае час, а калі я бываю з табой, пра яго забываю.

ШТО ЗДАРЫЛАСЯ?

— Дарагая Ёля, — усклікнуў малады чалавек, — ты ўсё, што ў мяне ёсць на свеце!

— Божа мой! Што здарылася? Ты разбіў свой самаход?

КАЗКА

Маленькі Пеця. Мама, а казкі заўсёды пачынаюцца з «аднойчы»..?

Мама. Не, мілы, не заўсёды. Часам яны пачынаюцца з «Дарагая, я крыху затрымаюся на рабоце...»

Латышскі гумар

ПРАВУЧЫЎ

Уласнік маёнтку Стэндэ любіў раніцай выходзіць на балкон у адной бялізне. Даведаўся пра гэта цыган Янціс і вырашыў правучыць барона.

Убачыўшы на балконе чалавека ў бялізне, Янціс падыйшоў і сказаў:

— Добрай раніцы, пудзіла. А шаноўны пан барон дома?

ПРАПАЖА

У памешчыка прапала свіння. Ён паслаў людзей і сам пайшоў на пошукі. Сустрэўшы селяніна, хацеў яго спытаць, ці не бачыў той свінні. Але памешчык быў немцам і не ведаў, як па-латышску «свіння». Таму спытаў:

— Слухай, ты выпадкова не бачыў дамы з двума радамі гузікаў на жываце?

ПЕСНІ ПА ЗАЯЎКАХ

Па просьбе Зоі Аўласюк і Валі Галёнка з Арэшкава Гайнаўскага павету змяшчаем песню:

GDZIE SĄ TE ŁĄKI

Gdzie są te łąki, cośmy brodzili,
gdzie są te ścieżki, cośmy schodzili,
gdzie bukowiny, cośmy zbłądzili,
gdzie ciemnogrzywy wiatr?...

Gdzie jest ten chłopak z gniadą czupryną,
który całował mnie pod buczyną,
gdzie cisza biała nad połoniną,
gdzie bujny zapach traw?..

Nie zapomnij o nas,
lesie, łąko, skało,
nie zapomnij o nas,
ptaku, drogo, trawo,
nie zapomnij o nas,
wodo, biała wodo,
nie zapomnij o nas,
o, nie zapomnij o nas.
Powróć bujny wiatr,
powróć gorycz traw,
powróć wody chłodny cień,
powróć nocą sen,
powróć dobry dzień,
biała wodo, daj nam znak.

Gdzie są te noce,
gdy sen przybiegał,
aby się łasić, jak młody źrebak,
przez góry, chmury, z samego nieba
pod nasz rodzinny dom.

Gdzie pokochanie serca całego,
gdzie całowanie do dnia białego,
gdzie nasze listy łzami pisane,
gdzie ciepło twoich rąk...
Nie zapomnij o nas...

— *Не разумеем, чым мы менавіта абмяжуем вашу ініцыятыву?*

АПЕРАЦЫЯ

Воўк апэрыруе хворую жабу. Раз-пораз чуюцца яго каманды:

— Скальпель...

— Пінцэт...

— Спірт...

Пчала-асістэнт праз акенца падае яму неабходнае.

— Спірт! — зноў камандуе Воўк. — Спірт... Ячшэ раз спірт...

Яшчэ праз некаторы час гучыць яго прыцішаны голас:

— Агурка...

...Яна з салодкаю ўсмешкаю падавала пракіслы боршч.

...Ён увесь час хоць і кіпеў, але крыткі не перавaрваў.

КУРЁЗЫ

ШТО ГУСІ РАЗУМНЫЯ, КОЖНЫ ВЕДАЕ...

...таксама як, дарэчы, і тое, што іх продкі выратавалі Рым. Зыходзячы з гэтага, курсанты паліцэйскага вучылішча ў Ганконгу вырашылі паспрабаваць ставіць на начны пост ля ўваходу ў казарму гуся. Вынік быў надзвычайны. Пасля трохчатырох заняткаў новы вартаўнік дасканала засвоіў свае абавязкі і не прапускаў нікога з чужых. Калі ж гусю пашылі на заказ новенькую форму, дык ён, відаць, заганарыўшыся, перастаў упускаць у казарму і курсантаў, калі тыя прыходзілі пасля адбою.

ВЕРНІСАЖ ЗЛОДЗЕЯ

У паліцэйскім упраўленні Кёльна (ФРГ) адкрылася незвычайная міжнародная выстаўка. На ёй дэманструюцца творы мастацтва (гравюры, эстампы і г.д.), адабраныя ў аднаго злодзея, які дзейнічаў у розных краінах свету. Усяго выстаўлена 1 200 экспанатаў, ацэньваемых у 100 тысяч марак. Як заявілі арганізатары выстаўкі, яна адкрыта з мэтай дапамагчы пацярпеўшым уладальнікам гэтых твораў мастацтва адшукаць іх. У той жа час выстаўка дэманструе вышыні «майстэрства» злодзея.

Сміёмся з нас саміх

Не кажыце самі аб сабе дрэнна — у іншых гэта атрымліваецца значна лепш.